ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Літаратура і мастацтва

№ 14
24 ЛІПЕНЯ 1932 г.
г. Менск
Цана асобнага нумару 5 кап.

Орган арганізацыйнага камітэту Саюзу савецкіх пісьменьнікаў і Галоўмастацтва БССР

Мастацкімі творамі сустрэнем XV гадавіну Кастрычніка

Мы стаім напярэдадні вялікага творчага ўздыму савецкай літаратуры і мастацтва БССР. Пастанова ЦК УсеКП(б) пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый, праводзеньне яе ў жыцьцё, стымулюе савецкіх пісьменьнікаў на творчую работу, робіць паварот літаратурна-мастацкіх арганізацый тварам да творчых задач. Змаганьне за літаратуру і мастацтва вартае нашай герайчнай эпохі ня можа весьціся на аснове цыркулярнай» пісаніны і адміністрацыйнай мітусьні. Пісьменьнікі і мастакі ў першую чаргу ўдзельнічаюць у сацыялістычным будаўніцтве сваёй творчасьцю, сваёй мастацкай дзейнасьцю. Вось чаму партыя заўсёды зьвяртала ўвагу літаратурна-мастацкіх арганізацый на тое, што патрэбна найменш адміністраваньня, а больш выхаваўчай работы, творчай работы. Тое, што мы стаім перад тварам творчага росту савецкай літаратуры і мастацтва БССР сьведчыць колькасны і асабліва якасны рост літаратурнай і мастацкай прадукцыі апошняга часу, так і вялікая творчая работа савецкіх пісьменьнікаў і мастакоў.

У гэтым годзе зьявіцца цэлы шэраг буйнейшых твораў савецкай літаратуры БССР—Платон Галавач піша раман пра працэсы сацыялістычнай перабудовы вёскі, гэту-ж тэму распрацоўваюць Крапіва ў вялікім рамане «Мядзьведзічы», Зарэцкі ў рамане «Вязьмо», Ц. Гартны і інш.; Міхась Лынькоў заканчвае свой раман, дзе адлюстроўвае асноўныя этапы разьвіцьця вёскі ад рэвалюцыйнай пары да цяперашняга часу, і дзе асноўным будзе зьвяўляцца інтэрнацыянальная еднасьць працоўных.

Шэраг вельмі значных праблем распрацоўвае і савецкая паэзія. У гэтым годзе выйдуць асобнымі кніжкамі новыя творы А. Александровіча, П. Броўкі, А Зарыцкага, А. Куляшова, Ю. Таўбіна, Ул. Хадыкі, П. Глебкі, С. Ліхадзіеўскага і інш., якія ў вобразнай паэтычнай форме адлюстроўваюць гераізм нашай эпохі, узьнімаюць на вырашэньне вельмі важныя праблемы нашага часу.

Мы асобна, як дадатны факт, адзначаем творчую актывізацыю за апошнія часы Янкі Купалы.

Дасягненьнем у творчай рабоце, якую вядуць нашыя пісьменьнікі зьяўляецца тое, што многія т.т. спэцыяльна працуюць над праблемамі абароннае тэматыкі, над паказам змаганьня нашай Чырвонай арміі, імкнуцца паставіць сваё мастацкае слова на справу абароны савецкіх меж.

З іх над п'есай пра Чырвоную армію працуе тав. Кобец, праблемы абароны распрацоўваюць т.т. Каваль, Баракавых, Сташэўскі, Вольны, Бядуля Мурашка і інш.

Мы маем за апошні час рост драматургічнай прадукцыі. Мы маем значны паварот нашых пісьменьнікаў тварам да задач тэатру.

Александровіч напісаў п'есу «Напор», Кузьма Чорны напісаў п'есу «Лета», да 15-й гадавіны Кастрычніка піша п'есу «Бацькаўшчына» для БДТ-1, напісаны новыя п'есы т. Гурскім, Якубам Коласам, Сташэўскім і інш.

Ёсьць пэўныя адзнакі павароту савецкіх пісьменьнікаў да распрацоўкі маладзежных праблем, да паказу камсамолу на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта сьцьвярджаецца і работай творчай групы камсамольскіх пісьменьнікаў.

На новую якасна-вышэйшую ступень узьнялася творчасьць рабочых ударнікаў, пра што сьведчыць шадрых таваны да друку другі зборнік творчасьці рабочых ударнікаў і творчы рост такіх таварышоў, як П. Шэвэйдэль, С. Шаўцоў, М. Бацюшкоў і інш.

Творчы ўздым ёсьць сярод буйнейшых яўрэйскіх, польскіх і інш. савецкіх пісьменьнікаў БССР.

Трэба адзначыць творчы рост у галіне тэатральнага мастацтва, выяўленчага, кіно-мастацтва, і інш.

Надыходзіць 15-я гадавіна Кастрычнікавай рэвалюцыі, дата якая мае выключнае значэньне для ўсяго сусьветнага пралетарыяту.

Увесь фронт літаратуры і мастацтва павінен дэманстраваць, рапартаваць партыі, вялізарнымі творчымі дасягненьнямі, літаратурнымі і мастацкімі творамі выключнай ідэёвай насычанасьці і мастацкай сілы.

Ці дастаткова мы рыхтуемся да гэтае вялікае і гістарычнае даты? Не, далёка недастаткова. Справа ў тым, што многія з пералічаных намі пісьменьнікаў працуюць яшчэ над сваімі творамі, творы гэтыя знаходзяцца ў стадыі скончэньня, канчатковага афармленьне, або нават напісаньня.

Зразумела, што летні час, параўнаўча невялікі, час, які застаўся да сьвяткаваньня 15 гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі трэба выкарыстаць такім чынам, каб забясьпечыць найбольш інтэнсыўную работу савецкіх пісьменьнікаў БССР, з тым, каб сапраўды мастацкімі творамі сустрэць вялікую гадавіну.

Трэба проста сказаць, што аргкамітэт Саюзу савецкіх пісьменьнікаў далёка недастаткова прыняў усе захады, каб савецкія пісьменьнікі інтэнсыўнай работай у летні час змаглі запоўніць прабел і ў мінулай рабоце, ня былі створаны ўмовы для пленнай работы пісьменьнікаў.

Трэба сказаць, што ў нашай творчай рабоце, у нашай рабоце па адзначэньню вялікае гадавіны,—рэзка адстаюць філіялы Саюзу савецкіх пісьменьнікаў у раёнах, і нацыянальныя секцыі ў Менску, асабліва польская секцыя.

Але зусім дрэнна рыхтуюцца да 15 гадавіны Кастрычніка фронт кіно-мастацтва, музыкі і нават тэатру.

Кіраўнікі кіно-фронту ня рыхтуюць да гэтай гістарычнай даты ніводнага больш-менш буйнага кіно-фільму, пісьменьніцкія масы ня ўцягнуты ў справу напісаньня сцэнарыяў, а між тым, шырокая работа і ўцягненьне пісьменьніцкіх мас у справу напісаньня сцэнарыя пра Кастрычнік на Беларусі, дала-б больш пленныя вынікі, чым «саматужная» замкнёная работа над гэтай праблемай у рамках «сваіх кадраў».

Больш таго, мы маем факты, калі лепшыя сцэнары нашых савецкіх пісьменьнікаў марынуюцца цэлымі гадамі на фабрыцы («Двойчы народжаны» Р. Кобеца, сцэнары пра пагранічнікаў А. Вольнага і інш.)

Такое-ж становішча мы маем і на музычным фронце. Кампазытары ўсё яшчэ кладуць на музыку дрэнныя, халтурныя «сьцішкі», замест таго, каб выкарыстаць лепшыя дасягненьні савецкае, беларускае, яўрэйскае і польскае паэзіі БССР.

Значна адстае і фронт выяўленчага мастацтва ў падрыхтоўцы да сьвяткаваньня 15-й гадавіны Кастрычніка.

Галоўмастацтва БССР, якое абмяжавалася запозьненым абвяшчэньнем конкурсу на літаратурныя і мастацкія творы больш амаль нічога ня робіць для рэалізацыі сваіх пастаноў.

У той час, як найбуйнейшыя выдавецтвы РСФСР рыхтуюць спэцыяльныя выданьні лепшых дасягненьняў савецкай літаратуры, лепшых мастацкіх твораў, багата ілюстраванымі, Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі пра спэцыяльныя выданьні да гадавіны Кастрычніка нічога і ня думае.

Перад намі неадкладныя задачы. Да сьвяткаваньня гадавіны Кастрычніка засталося мала часу. Трэба мабілізаваць увесь фронт літаратуры і мастацтва, каб рэшту летняга часу выкарыстаць на найбольш інтэнсыўную творчую работу на тое, каб падцягнуць найбольш адсталыя вучасткі мастацкага фронту. Апошні час даў пэўныя зрухі на літаратурным фронце. Трэба перш-на-перш адзначыць дадатную ролю Беллачафу, які накіраваў найбольш выдатных савецкіх пісьменьнікаў у чырвонаармейскія часьці для вывучэньня жыцьця і побыту Чырвонай арміі. За апошні час шэраг пісьменьнікаў накіраваны на буйнейшыя фабрыкі і заводы, у калгасы.

Фронт кіно-мастацтва, музыкі, тэатру, выяўленчага мастацтва павінны падцягнуцца, гэтак як і раённыя філіялы ССП, як і нацыянальныя сэкцыі. Трэба асабліва зьвярнуць увагу буйнейшых савецкіх пісьменьнікаў на стварэньне твораў абароннай літаратуры. Павярнуць фронт літаратуры і мастацтва тварам да творчых задач. Упарта змагацца за высокую якасьць мастацкай прадукцыі.

У 15-ю гадавіну Кастрычніка дэманстраваць нашы перамогі літаратурнымі і мастацкімі творамі вялікай ідэёвай і мастацкай сілы.

БДзТ-2 у сэзоне 1931-32 году

Сэзон 1931-32 г. Беларускі 2-гі Дзяржаўны Тэатр працаваў у Гомелі і Магілеве. Праца тэатру ў гэтым сэзоне ішла па шляху замацаваньня і паглыбленьня тых ідэёвых пазыцый, якія ён вызначыў у папярэднім сэзоне 1930-31 г., ішла пад знакам напружанай барацьбы за стварэньне нацыянальнага пралетарскага рэпэртуару, стварэньня і выхаваньня ўласных акторскіх кадраў, авалоданьне навуковым мэтадам Маркса-Леніна—дыялектычным матарыялізмам, у змаганьні за тэхнічную рэканструкцыю тэатру. У некаторых з гэтых галін дасягнуты значныя посьпехі, у некаторых-жа зроблена вельмі мала.

Рэпэртуар: тэатр выпусьціў п'есу Андрэя Александровіча «Напор», М. Ільлінскага «Вясна» і выпускае зараз у часе гастроляў у Менску—«Амэрыка» В. Сташэўскага.

На працягу будучага сэзону тэатр мяркуе працаваць над наступнымі п'есамі: Я. Колас «Вайна да пабеднага канца», В. Сташэўскі «Дзяржынцы» (назва ўмоўная), п'еса прысьвечаная 15-цігадзьдзю Кастрычнікавай рэвалюцыі і адна клясычная—альбо Бомаршэ «Жаніцьба Фігаро», альбо Фонвізіна «Недаросль». Апрача гэтага піша новую п'есу для БДзТ2 Андрэй Александровіч.

У сэзон 1931-32 г. пры тэатры працавала школа тыпу фабзавуча для навучаньня і падрыхтоўкі кадраў для БДзТ2. Склад гэтага «Тэафабзавуча» даходзіў да 22 асоб. Выкладалася: тэхніка сцэнічнага мастацтва, штукарства імправізацыі, пастаноўка голасу, грым, акрабатыка і інш. Уся праца «Тэафабзавуча» была шчыльна ўвязана з усёй бягучай вытворчай працай тэатру. На аснове вопыту мінулага сэзону тэатр мяркуе ў далейшым гэты бок працы яшчэ больш паглыбіць і ўдасканаліць.

У галіне працы над авалоданьнем марксыцка - ленінскай мэтадалёгіяй тэатр не зрабіў яшчэ ўсяго, што было ў яго магчымасьцях. Толькі пры авалоданьні гэтым тэатр зможа стаць сапраўднай зброяй партыі і пралетарыяту ў змаганьні за новыя дасягненьні, у змаганьні за сацбудаўніцтва.

Нарэшце адным з самых вузкіх месц працы тэатру—тэхнічная рэканструкцыя.

БДзТ2, як і іншыя тэатры БССР задыхаюцца ад недахопу кваліфікаваных кадраў, тэхскладу тэатру: няма бутафораў, краўцоў, парыкмахэраў, рэквізытараў, адміністратараў і інш. катэгорый, што складае арганізм тэатру.

Пытаньням забесьпячэньня тэатраў будаўнічымі матар'яламі і мануфактурай кіруючыя арганізацыі ня прыдаюць належнай увагі. Гэта вядзе да зрыву якасных і колькасных паказьнікаў і балюча адбіваецца на прамфінплане тэатру.

З недахопаў тэатру ў сэзоне 1931-32 г. трэба адзначыць невыстарчальную сувязь з рабочым гледачом. Было шмат выпадкаў зрываў культвылазак на заводы толькі з прычыны галаваццёпскіх адносін культпрацаўнікоў паасобных заводаў, а таксама з прычыны неарганізаванасьці і нягібкасьці грамадзкіх арганізацый тэатру.

У часе вясновай сяўбы 1932 г. тэатр паслаў у калгасы 2 брыгады складам па 10-12 чалавек кожная. Гэтыя брыгады за два тыдні свае працы праявілі вялічэзную грамадзка-палітычную і грамадзкую працу, мабілізуючы ўвагу калгасьнікаў на найлепшае завяршэньне сяўбы. Рэпэртуар у гэтых брыгадах быў актуальны і патрэбны. Брыгада атрымала да 20 адрасоў.

Абслужыла да 50 калгасаў, зрабіўшы 32 выступленьні, пабудавала 9 сцэн, выпушчаны насьценгазэты, праводзілася вайсковая праца, гутаркі на тэму апошніх пастаноў партыі і ўраду пра сельска-гаспадарчы падатак, калгасныя базары і інш.

Гастролі БДзТ-2 распачнуцца 25 ліпеня і працягнуцца два месяцы. Будуць паказаны: «Напор», «Вясна», «Качагары», «Амэрыка». Тэатр будзе працаваць у памяшканьні Яўрэйскага Дзяржаўнага тэатру БССР.

М. А.

Новая часопісь „Мастацтва і Рэвалюцыя“

Хутка выйдзе першы нумар часопісі «Мастацтва і Рэвалюцыя». Самы факт выданьня гэтай часопісі сьведчыць пра рост пралетарскай нацыянальнай культуры, сьведчыць пра рост пралетарскага нацыянальнага мастацтва ў БССР.

«Задачай часопісі «Мастацтва і Рэвалюцыя»,—як гаворыцца ў перадавіцы першага нумару—зьяўляецца рашучая барацьба за перабудову мэтадаў і форм работы ў галіне тэатру, кіно, музыкі, выяўленчага і самадзейнага мастацтва па-новаму, на аснове гістарычных указаньняў т. Сталіна, за ленінскі этап у мастацтвазнаўстве, мабілізуючы ўвесь фронт мастацтва на ажыцьцяўленьне пастаноў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі аб зьнішчэньні перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей і паказ новых будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Першы нумар часопісі «Мастацтва і Рэвалюцыя» прысьвечаны перабудове работы мастацкага фронту, падагульненьню пяцігадовай творчай дзейнасьці яўрэйскага дзяржаўнага тэатру БССР і пяцігадовай творчай дзейнасьці БДТ-2. Першаму пытаньню апрача пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый і пастановы пленуму ЦК КП(б)Б у галіне мастацтва прысьвечаны перадавы артыкул «За Магнітабуды беларускага мастацтва». Падагульненьню пяцігадовай творчай дзейнасьці ЯДзТ і БДзТ-2 прысьвечаны артыкулы: В. Вольскага і М. Модэля «Пяць год творчай дзейнасьці Яўрэйскага Дзяржаўнага тэатру БССР» і В. Вольскага «На парозе 2-й пяцігодкі» (пяць год БДзТ-2)». Апрача асьвятленьня гэтых пытаньняў у першым нумары зьмешчаны артыкулы: І. Гурскага «15-ці годзьдзе Кастрычнікавай рэвалюцыі і задачы фронту мастацтва», артыкул прафэсара Барычэўскага—«Гётэ і тэатр», М. Каменскага—«На шляху да бальшавіцкага паказу», Б. Норда—«Пра оперу Кармэн», архітэктара Лаўрова пра пабудову новага будынку тэатру ў г. Менску і інш.

Выданьне біяграфій выдатных гістарычных дзеячоў

Па ініцыятыве Максіма Горкага ў гэтым годзе будзе пачата выданьне біяграфій выдатнейшых гістарычных дзеячоў палітыкі, навукі, тэхнікі, літаратуры і мастацтва. У 1932 г. мяркуецца падрыхтаваць да друку і выпусьціць першыя 4—6 кніг.

У 1933 г. будуць выданы біяграфіі Гуттэнбэрга, Эдысона, Лавуазье, Дарвіна, Ціміразева, Кука, Робэсьп'ера, Лібкнехта, Жалябава, Чарнышэўскага, Пэсталёцы, Дантэ, Байрона, Гайнэ, Некрасава, Мальера, Лермантава, Гогаля, Бэранжэ, Вольтэра і інш. Асноўная задача выданьня біяграфій вялікіх людзей—даць марксыцкі аналіз таго сацыяльнага асяродзьдзя, у якім вялікім людзям прыходзілася жыць і працаваць, высьвятліць розьніцу становішча чалавечай асобы ў эпоху дакапіталістычных і капіталістычных адносін і ў пэрыяд будаўніцтва сацыялізму.

У якасьці рэдактароў да работы запрошаны М. Горкі, А. В. Луначарскі, акадэмік Вавілаў, праф. Шмідт, Л. Б. Каменеў, Н. В. Крыленка, Н. А. Сямашка і інш. Склад адказнай рэдкалегіі: М. Горкі, Л. Б. Каменеў, М. Е. Кальцоў, А. Н. Ціханоў.

Чужаземныя пісьменьнікі пра СССР

Да XV гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі ГІХЛ выпускае спэцыяльны зборнік: «Чужаземныя пісьменьнікі пра СССР». У зборніку будуць сабраны выказваньні пісьменьнікаў Бэхэра, Вайскопфа, Глезэра, Драйзэра, Дзюамэля, Келермана, Дж. Пассоса, Джон Рыда, С. Сынклера, Г. Уэльса, Цвайга, Бэрнарда Шоў і інш.

Зборнік выйдзе з прадмовай Карла Радэка, партрэтамі аўтараў і крытычнымі артыкуламі пра іх творчасьць.

Новыя рэдкалегіі літаратурных часопісаў РСФСР

28-га чэрвеня адбылося паседжаньне прэзыдыуму арганізацыйнага камітэту саюзу пісьменьнікаў РСФСР, на якім былі абмеркаваны пытаньні: пра склад рэдкалегій, пра закон аб аўтарскім праве і пра становішча літаратурных гурткоў.

**

Адказны рэдактарам «Литературной газеты» зацьверджаны т. С. С. Дынамаў. Членамі рэдкалегіі тт. Багрыцкі, Кальцоў, Лідзін, Селіваноўскі, Сяльвінскі, М. Субоцкі, Серабранскі, Усіевіч.

Рэдкалегія часопісу «Красная новь» зацьверджана ў складзе: тт. Бахмецьцева, Беразоўскага, Ярмілава, Усевалода Іванова, Луппала, Панферава, Фадзеева, Шагінян.

Рэдкалегія часопісу «Октябрь»: тт. Афінагенаў, Бязыменскі, Жараў, Ільянкоў, Агнёў, Панфераў, Суркоў, Шолахаў.

Рэдкалегія часопісу «Рост»: тт. Аболін, Кіршом, Каршуноў, Стаўскі.

У мэтах палепшаньня якасьці крытычнай работы пастаноўлена часопісы «Марксистско - ленинское искусствознание», «Пролетарская литература» і «На литературном посту» злучыць у адзін штомесячны часопіс. У рэдкалегію новага часопісу ўвайшлі тт. Гронскі, Дынамаў, Зялінскі, Ілеш, Кірпоцін, Кіршон, Сутырын, Серафімовіч, Юдзін.

Выданьне часопісу «Пролетарский авангард» пастаноўлена спыніць.

**

Тав. Ф. Беразоўскі даклаў прэзыдыуму пра папярэднюю прапрацоўку закону аб аўтарскім праве. Асноўныя зьмены гэтага закону ўжо ўзгоднены з «ОГИЗ» і камітэтам па справах друку.

Праект прадугледжвае грунтоўнае палепшаньне умоў працы аўтараў.

Прэзыдыум аргкамітэту вырашыў хадайнічаць перад урадавымі інстанцыямі зацьвердзіць праект.

**

Прэзыдыум абмеркаваў інфармацыю пра становішча літгурткоў. Камісія аргкамітэту па гуртках праз сваіх прадстаўнікоў абсьледвала становішча работы гурткоў у Маскве і зьвязалася з пэрыфэрыяй. Абсьледваньне гурткоў Масквы выявіла, што да моманту пастановы ЦК УсеКП(б) ад 23-га красавіка, з 32-х гурткоў фактычна працавала толькі палова. Вызначаны шэраг мерапрыемстваў па заналяваньні работы гурткоў. Прэзыдыум аргкамітэту падкрэсьліў неабходнасьць хутчэй забясьпечыць усе гурткі кіраўнікамі.

**

У новую рэдакцыю ленінградзкага часопісу «Зьвязда», які будзе выходзіць як орган аргкамітэту Ленінградзкага саюзу пісьменьнікаў, увайшлі тт. Беліцкі (адказны рэдактар), Ціханаў (нам. адк. рэдактара), Федзін, Слонімскі, Чумандрын, Форш, Лаўрухін і Осіпаў.

Адчыненьне польскага дзяржаўнага тэатру

Адчыненьне польскага дзяржаўнага тэатру імя 11 ліпеня.

10 ліпеня адбылося ўрачыстае адчыненьне польскага дзяржаўнага тэатру ў будынку былога новага касьцёлу, які перабудованы пад тэатр паводле праекту вядомага архітэктара Лаўрова.

Урачыстае паседжаньне адчыніў Народны Камісар Асьветы тав. Платун, які ахарактарызаваў тыя вялікія дасягненьні на культурным фронце, што дасягнуты намі за 12 год.

Таварышы Кеніг і Клыс у сваіх выступленьнях падрабязна спыніліся на нашых дасягненьнях ў галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, падкрэсьлілі тыя вялізарныя дамаганьні польскіх працоўных мас аб заключэньні дому цемры і ашуканства, аб вялізарным росьце сьвядомасьці польскіх працоўных мас.

Далей з прывітаньнямі выступілі: ад ЦСПСБ тав. Клімковіч, ад рабочых Менскае электрастанцыі тав. Кавалеўскі, ад польскага настаўніцтва тав. Асташэўскі.

Тав. Платун паведаміў аб наданьні тэатру назвы імя 11 ліпеня і аб прэміраваньні лепшых ударнікаў, якія змагаліся за хутчэйшую пабудову тэатру. Гэта паведамленьне было сустрэнута гучнай авацыяй.

Польскі Дзяржаўны Тэатр атрымаў шмат прывітальных тэлеграм з усяго Саюзу.

Вечар закончыўся вялізарным інтэрнацыянальным канцэртам.

На фронце сацыялістычнага будаўніцтва пралетарыят БССР здолеў з посьпехам выканаць справу пабудовы яшчэ адной культурнай адзінкі.

У дзень XII гадавіны вызваленьня БССР ад белапалякаў—пралетарыят Менску сьвяткуе адчыненьне ўноў пабудаванага тэатру, што зьяўляецца сьвятам пралетарыяту ўсяе БССР.

Прэзыдыум ЦП Працмастацтва ўпэўнены, што Польскі Дзяржаўны тэатр БССР пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі на падставе няўхільнага праводзеньня генэральнай лініі партыі здолее ажыцьцявіць ў справе ленінскую нацыянальную палітыку, стаўшы моцнай культурнай адзінкай і дапаможнікам у выхаваньні шырокіх польскіх працоўных мас БССР.

Няхай жыве камуністычная партыя, пад кіраўніцтвам якой пралетарыят БССР пойдзе да далейшых перамог!

Няхай жыве ленінская нацыянальная палітыка!

Няхай жыве мастацтва нацыянальнае па форме, і пралетарскае па зьместу!

Няхай жыве Польскі Дзяржаўны тэатр БССР!

Прэзыдыум ЦК Белпрацмастацтва.

Абароннай тэме—баявая ўвага

(Ліст з Смаленску)

Пры «Чырвонаармейскай праўдзе»—акруговай вайсковай газэце, зараз стварылася творчая група беларускіх чырвонаармейскіх пісьменьнікаў. У групу ўваходзяць: А. Самахвалаў, В. Кавэль, М. Макаеў, Я. Садоўскі і інш. Група ставіць сваёй мэтай актывізаваць літаратурную старонку ў «Чырвонаармейскай Праўдзе». Старонка выходзіць досыць рэгулярна. Яна зьяўляецца амаль адзіным пэрыядычным органам беларускіх чырвонаармейскіх пісьменьнікаў. Але старонка ня стала масавай, яна ня выхоўвае маладых чырвонаармейскіх пісьменьнікаў, ня робіць кансультацый, не дапамагае.

Група ставіць савёй мэтай зрабіць гэту старонку сапраўды масавай, дабіцца мабілізацыі мастацкага слова на дапамогу задачам баявой падрыхтоўкі.

Праца творчай групы зможа быць толькі тады поўнацэннай, калі яна атрымае дапамогу ад Саюзу Савецкіх пісьменьнікаў, і лачафаўцаў, дапамогу матар'ялам, крытычнымі парадамі і г. д.

У апошні час у беларускіх газэтах і часопісах значна паслабела асьвятленьне абаронных тэм.

Зараз мы можам чакаць пералому. Група пісьменьнікаў атрымала творчыя камандыроўкі ў лягеры і практычна ўдзельнічае ў справе баявой падрыхтоўкі.

Творчая праца камандыраваных зразумела дасьць шмат карысьці толькі пры масавым абмеркаваньні кожнага твору, вершу, нарысу, прысьвечанага баявой вучобе.

Смаленскія беларускія лачафаўцы чакаюць творчай прадукцыі таварышоў камандыраваных у лагеры, каб шырока вывучыць яе, абмеркаваць, давесьці да мас байцоў.

Пытаньне стральковай вучобы (аўладаньне варашылаўскім стрэлам), пытаньні змаганьня за тэхніку, за рэвалюцыйную дысцыпліну, за высоты тактычнай вучобы, за высокую якасьць палітычнай вучобы—сёньня першачарговыя і яны павінны знайсьці самае шырокае асьвятленьне ў працы камандыраваных.

Творчая група пры «Чырвонаармейскай праўдзе» паставіла сваёй мэтай падрыхтаваць шэраг літаратурных старонак, на абаронныя тэмы, для беларускіх газэт (Літаратура і мастацтва», «Зьвязда і інш.).

Зараз таварышы з групы распачалі працу над шэрагам твораў прысьвечаных баявой вучобе.

Мастацкае слова—магутная зброя баявой падрыхтоўкі.

Чырвонаармеец, камандзір, палітрабетнік чакаюць твораў, прысьвечаных магутным тэмпам баявога жыцьця. Чакаюць твораў—песень!..

Абароннай тэме—баявая ўвага

Творчая група беларускіх лачафаўцаў у Смаленску чакае сур'ёзнай, дзелавой дапамогі.

Якім Садоўскі.

Ал. Пруднікаў

Качагар Драбушынскі

Жыцьцё яго з песьняю
 трэ' параднiць,
З песьняй—
 За сіняе мора шырэй.
Жыве ён са мною
 ў пакоі адным
Курсант—качагар Драбушынскі.
— Ідзі,—
 яго сябры сказалі яму,—
І гэта па-ўдарнаму,
 як і ў цэху,
Штодзённа ўпарта, Васіль,
 штурмуй
Вышыні навукі і тэхнікі!
... Мінаючы нівы, лясы і вазёры
вагоны па рэйках ўсю ноч стракаталі.
Далёка згасьлі маўклівыя зоры,
Гарэлі другія ў рабочых кварталах.
І вось ён ў Менску,
 калісьці далёкім,
З гурбой качагараў ідзе на вучобу.
І тут авалодвае
 Справай нялёгкай—
тэхнікай
 новых катлоў і топак.
Калі-ж туманы апускаліся з высяй
У сьціж ля дубровы над гладзьдзю
 лугоў—
Васіль Драбушынскі са мною дзяліўся
Здабыткам даўно адышоўшых год.
Ён глядзіць ў блакітную далеч.
Выразна акрэсьлены дугі брывей.
На твары сур'ёзным іскрыцца ста-
 ласьць
І лысіна белая на галаве.
На возера дум насуваецца крыга
Пражытага некалькі ім у палоне:
— Быў я ў Германіі
 (Лётарынгія)
І бачыў аблічча нямецкіх домен.
Ад шчырага сэрца табе кажу я—
Хваліцца аб іхняй краіне нечым
Побач з раскошным жыцьцём бур-
 жуяў
Мы бачылі—
 пенязу,
 пакуту,
 галечу.
Чатыры гады
 пад наглядам строгім
Галоднымі мы
 на работу хадзілі...
Рэвалюцыя нам
 адчыніла дарогу,
Вярнуліся мы
 на сваю радзіму.
. . . .
Адбеглі гады
 разбурэньне і ран.
Рэспубліка цепліцца
 працы агнямі.
У іх—
 іржавеюць машыны бяз спраў,
Мы іх—
 па тэхніцы пераганяем!
Ўрастае ў пляны наш энтузіязм.
Воляй і дужасьцю сіл жалезных
Куецца мільёнамі
 наша
 свая
тэхнічная незалежнасьць!
І мне вось такое заданьне далі,
Як пальцы свае—
 качагарку вызнаць,
Бо,—качагарка,—
 казаў Ільліч
Сэрца сацыялізму!

Памяці пралетарскага якабінца

ФЭЛІКСА ЭДМУНДАВІЧА ДЗЯРЖЫНСКАГА

(Шасьцігодзьдзе з дню сьмерці)

Я. Шапавалаў

Дзяржынскаму Ф. Э.

Мне ня трэба
 сябе сышчаць,
І песьні сваёй
 станавіцца на горла.
Голасам поўным
 хачу сказаць
Пра бальшавіка
 вялікага,
 простага,
 дарагога
 пра тога,
 чыё імя—
 эпохі гонар.
Той дзень
 захаваў каляндар.
Набіраў друкар
 наморшчыўшы лоб.
Чорную, простую дату:
 тысяча
 дзевяцьсот
 дваццаць шосты
 год.
 Ліпеня
 дваццатага.
Яшчэ раніцай
 палкі і стойкі
Полымем сэрца
 сеючы ў сэрцах віхор,
Жыў і палаў
 у клясавых бойках
Адзін з гартаваных
 бальшавікоў.
А калі на штурм
 паімчалася ноч,
Разьнес тэлеграф
 ад Уладывастоку
Да Менску:
 «ад прыступу жабы грудной
Памёр таварыш Дзяржынскі»...
Жыў ён проста...
 Памёр—як жыў,
За справу,
 ў якую верыў.

Спынілася кроў
 у рэчышчы жыл.
Чама... Фэлікса.
Чэ прыгрыў
 болю язаў.
Сіль няма забыцца.
 Горач страты
З чым параўнаць?
 Хто знойдзе сілу
Сьмерць стрымаць
Пралетарскага якабінца?
Калі кляса
 раджае такіх сыноў—
З плянэтаю значыць
 Зьнітована моцна,
Ня сьпіхнуць яе
 з кулі зямной—
Няма такой сілы
 пад сонцам!
Правадыра згубіўшы
 ў барацьбе
Рукі чэка ў бязвольлі
 ня зьвесіліся.
Горды я тым,
 што аддаў сябе
Справе, якою жыў Фэлікс.
Мо яшчэ няма ў календары,
Апавітага ў чырвонае квадрата,
Дзе сусьветнага Кастрычніка гарыць
Акрываўленая ў бойках дата.
Але ўжо ў друкарскіх касах
Лічбы гэтыя зьбіраюцца ў набор.
Кляса выступае супроць клясы,
Ідзе на бой.
Краіна,
 дзе ветры паўночныя, дуй,
Дзе нетры Кузбасу, дзе гмах Днепра
 буду,
 дзе тундры—
Гэта помнік, што будуецца
Фэліксу Эдмундавічу.

Пераклад з рускае мовы С. Л. і С. Ш.

На заводзе імя Варашылава літгурток распаўся

У ліпені месяцы 1931 г. у нас, на заводзе імя Варашылава (Менск) арганізаваўся літгурток, кіраўніком якога быў вызначаны ад БелАПП'у тав. Вісажар. З боку наведваючых была зацікаўленасьць да заняткаў. З ліку запісаных 26 асоб на заняткі зьяўлялася ад 18 да 23. На сходах літгуртка, (адбываліся 2—3 разы ў месяц) разьбіралі і вывучалі творы пралетарскіх пісьменьнікаў (Александровіч і інш.), а таксама праводзіліся гутаркі аб разьвіцьці літаратуры на Беларусі, пераверзеўшчыне і г. д. Багата ўвагі было аддадзена крытычнаму таварыскаму абмеркаваньне творчасьці літгуртукоўцаў пры непасрэднай дапамозе з боку кіраўніка гуртка. Такі сыстэматычны чулы падыход да творчасьці сяброў літгуртка даў добрыя вынікі. Цэлы шэраг таварышоў нашага заводу вырасьлі творча настолькі, што зараз друкуюцца ў шмат часопісах і газэтах (Нортман, Шаўцоў, Малашэнка, Лейбман, Эстэркін і інш.).

Але з боку кіраўніцтва БелАППУ'у, а таксама з-за слабага кіраўніцтва заводзкага калектыву КСМ было недастаткова зьвернута ўвагі на пастаноўку працы нашага гуртка. БелАПП пачаў мяняць кіраўнікоў гуртка. Замест тав. Вісажара быў прымацаваны ў якасьці кіраўніка пісьменьнік Ліманоўскі, які пабыў у нас толькі 2 месяцы.

З гэтага часу мы засталіся без сталых кіраўнікоў і ня гледзячы на тое, што літгуртакоўцы неаднойчы хадзілі ў БелАПП, дапамогі ні ад каго не атрымалі. Гурток распаўся.

Нашы гуртакоўцы друкуюць свае творы на старонках заводзкай шматтыражкі «Варшылавец», але гэтага зразумела вельмі мала. Мы жадаем працаваць калектыўна, хочам абмяркоўваць свае творы на паседжаньнях гуртка пры непасрэдным удзеле і дапамозе прадстаўнікоў Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў Беларусі. Мы жадаем, каб у нашай творчай вучобе дапамагаў калектыў савецкіх пісьменьнікаў. Для разгортваньня работы лічым неабходным у першую чаргу зрабіць наступнае:

1) Вылучыць і замацаваць да гуртка прадстаўніка Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў Беларусі, які кіраваў-бы і адказваў за працу літгуртка.

2) Стварыць пры Саюзе СПБ творчую кансультацыю, дзе-б рабочы літгуртковец змог-бы атрымаць слуханьне і дапамогу ў творчай працы.

3) Арганізаваць творчыя вечары літгуртоўцаў сумесна з пісьменьнікамі, паставіць пытаньне аб творчай вучобе рабочых ударнікаў, заклікаваных ў літаратуру, праводзіць гутаркі з пісьменьнікамі аб мэтадах працы і г. д.

Па даручэньню літгуртоўцаў заводу.

Ул. Козел.

Ад рэдакцыі: «Л і М» чакае адказу на ліст варашылаўцаў ад прэзыдыуму Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР.

Брыгада пісьменьнікаў у Воршы і Магілеве

Брыгада пісьменьнікаў у складзе П. Галавача, Ю. Таўбіна, А. Вольнага выяжджала з мэтаю папулярызацыі пастановы ЦК УсеКП(б) у Воршу і Магілеў.

У Воршы быў праведзены літаратурны вечар па радыё і наладжаны выступленьні ў Пэдтэхнікуме і на раённай канфэрэнцыі рабкораў і лёгкіх кавалерыстаў.

У Магілеве адбыўся вялікі літаратурны вечар у Пэдінстытуце. Была праведзена нарада аргкамітэту саюзу савецкіх пісьменьнікаў г. Магілева разам з актывам літгурткоў.

Яз. Карпашэвіч

Упарта вучыцца

Перад намі творчасьць гомельскіх пісьменьнікаў, зьмешчаная ў літстаронках гомельскай раённай газэты «Палеская праўда», выпушчаных на працягу часу ад кастрычніка 1931 г. па чэрвень 1932 г. Ужо сам факт выпуску літстаронкі зьяўляецца дадатным, сьведчыць пра тое, што газэта аддала значную ўвагу пытаньням савецкай мастацкай літаратуры.

Мастацкая творчасьць у літстаронках складаецца з вершаў і нарысаў больш-менш выяўленых таварышоў (Салабенка, Бужан, Мельнікаў), таксама і рабочых літгурткоўцаў, якія толькі выяўляюцца (Хадыка, Южык, Глінкін, Ліўшыц, Лукашэнка, Мірошнікаў). Тэматыка большасьці твораў —завод, паказ камсамольца ўдарніка, падрыхтоўка пралетарскіх кадраў. вайсковая тэма, калгас і, як выключэньне, лірычныя вершы. Ужо гэты беглы пералік тэм выяўляе імкненьне шчыльна падыйсьці да актуальных праблем нашай сучаснасьці, актыўна ўключыцца ў пераможны ход сацыялістычнага будаўніцтва, адлюстраваць тыя працэсы, непасрэднымі ўдзельнікамі якіх зьяўляюцца аўтары. Але ці стаіць на належнай ідэёвай і мастацкай вышыні вырашэньне ўзятых праблем?

Усебакова ахарактарызаваць творчасьць Р. Сабаленкі па чатырох вершах («Зямля», «Лірычны разьбег» «Вайна вайне», «Брыгадніца») нельга. У гэтых вершах побач з момантамі яскравымі, якія палітычна-правільна ўскрываюць сутнасьць тэмы («Вайна вайне», Брыгадніца») ёсьць цэлы шэраг недахопаў, якія прыводзяць паэта да сур'ёзных творчых зрываў. У такіх вершах, як «Лірычны разьбег», «Зямля» не адчуваецца глыбока-прадуманай працы над тэмай, яе выношваньня, усебаковага асэнсоўваньня. Паэт толькі коўзаецца па тэме, замест дыялектычнага раскрыцьця таго, пра што піша, дае агульныя разважаньні, напрыклад, пра песьню:

«Песьні, як бура,
Песьні, як гром
Урываюцца ў быт наш».

У гэтым вершы канкрэтнага паказу значэньня песьні няма.

Сабаленка ў гэтых вершах толькі фіксуе факты, але ня ўзьнімаецца да мастацкага сынтэзу іх. Таму ня ўпэўнівае нас паказ камсамольцаў толькі ў шагістыцы, ў парадах:

«Вунь, камсамольцы,
Сігаюць на пляц,
Парадам брукуючы вуліц асфальт»
(«Зямля»)

(Да рэчы, як гэта можа брукаваць асфальт?). Ня ўпэўнівае нас таксама і паказ эпохі не ў канкрэтных людзях і справах, а толькі агульна, адцягнена:

«Вялікіх бур
Узьлётаў спрытных»
(«Лірычны разьбег»)

або касьмічна:

«У гэткім кіпучым
ёагністым прасторым,
Дзе зоры, як зоры.
Дзе месяц звычайны
Шлындае ў небе каханкам.
(«Зямля»)

Ня ўпэўніваюць нас гэтыя вершы таму, што не даюць сапраўднага ўяўленьня пра нашу эпоху вялікіх работ. Павярхоўны падыход да вырашэньня тэмы, няўмельства ўзьняць яе на належную вышыню, у некаторых выпадках пагоня за рыфмай, прыводзяць да неапрацаванасьці вершу, перагрузкі яго непатрэбнымі сказамі, да цэлага шэрагу незразумелых слоў, якія ў некаторых выпадках патрэбны пісьменьніку для рыфмы.

У вершах «Вучоба», «Яны ідуць» Саламон Мельнікаў імкнецца распрацаваць надзвычайна актуальныя тэмы. Але нізкі тэарытычны ўзровень, крыху нясур'ёзныя адносіны да пастаўленай задачы, ня гледзячы на рад удалых поўнакроўных момантаў, не даюць яму магчымасьць вырашыць іх сапраўды так, як трэба. Асабліва небясьпечным для Мельнікава зьяўляецца імкненьне перагрузіць свае вершы чужаземнымі словамі, сэнс якіх у некаторых выпадках пісьменьніку няясны, жангляваньне словам, пагоня за «сногсшибательными» вобразамі, накшталт «пад вакном падбітай упала рэканструкцыйная ноч» і г. д.

Пра вершы літгурткоўцаў рабіць некія закончаныя вывады па літстаронках мы яшчэ ня маем магчымасьці. Адно відаць, што тое, пра што яны пішуць, добра знаёма ім. Асабліва па трэбна адзначыць удалы твор Лукашэнкі «Тамара», у якім аўтару (праўда, яшчэ вельмі недастаткова) удаецца даць вобраз ударніцы камсамолкі Хромавай. Але з асаблівай яскравасьцю патрэбна адзначыць і тое, што творы літгурткоўцаў гавораць і аб неабходнасьці вучобы, падвышэньня тэарэтычнага ўзроўню; яны яшчэ вельмі неканкрэтна выражаюць узятую тэму. У шэрагу вершаў мы маем. замест канкрэтнага паказу заводу, камсамольца-ўдарніка сацбудаўніцтва, толькі разважаньні пра ўсё гэта, а часта сустракаем і проста любаваньне словам, прыгожым выразам, рыфмай.

Проза літстаронак прадстаўлена нарысамі Р. Сабаленкі «Тры франты». Бужана, «Задні ход» і творамі маладога літгурткоўца Мірошанкі «Кадры» і «Неспакойны чалавек». Якасьць празаічнай прадукцыі, яе ідэёвая на сычанасьць, мастацкая вартасьць значна вышэй, чым паэзіі. Але і яна не пазбаўлена ад пэўных зрываў творчага мэтаду пісьменьнікаў.

Р. Сабаленка тэмай нарысу бярэ паказ энтузіяста-дырэктара саўгасу тав. Ешчына. Перш за ўсё кідаецца ў вочы статычны характар нарысу. Але асаблівую ўвагу прыцягвае тая частка яго, дзе апісваецца ўдзел Ешчына ў грамадзянскай вайне. Р. Сабаленка Кастрычніцкую рэвалюцыю, грамадзянскую вайну ўяўляе сабе, як час, «калі ў прасторах блукала дзікая сьмерць, кроў застывала ў калюжынах», як «гады. акаймаваныя чырвонай істужкай крыві, гады віхурнай рэвалюцыі, курод ому чакісцкіх пакояў». Тое, што ў рэвалюцыі, у грамадзянскай вайне Сабаленка бачыць толькі кроў, толькі віхуры, абмяжоўваецца гэтым, ня ўскрываючы клясавай сутнасьці падзей, якія адбываюцца ў гэты пэрыяд, а наадварот натуралістычным паказам затушоўваючы іх, прыводзіць да таго, што ён ня можа паказаць прычын, чаму яго герой Ешчын дабраахвотна ідзе ў Чырвоную армію, паказвае жыцьцё і працу апншняга, як шэраг душэўных зрываў, як «знэрвава насьць» і лячэньне яе самагонным пе рагарам». Гэтыя мейсцы зьяўляюцца відавочным зрывам.

Нарыс Бужана «Задні ход» у асноўным пакідае добрае ўражаньне. Але мы лічым патрэбным адзначыць залішні псыхалёгізм, які назіраецца ў паказе рабочага Антанюка. Замест паказу рабочага калектыву, таго, як пад ўплывам гэтага калектыву, у сумеснай рабоце з ім расьце сьвядомасьць паасобных рабочых, зьмяняюцца іх адносіны да працы, да вытворчасьці, аўтар толькі і спыняецца на псыхалёгічных перажываньнях свайго героя і такім чынам яго ідэйна-палітычнага росту, зьмену адносін да вакольнага па-мастацку паказаць ня можа.

Творы літгурткоўца Мірошніка «Кадры» і «Неспакойны чалавек» з аднаго боку паказваюць, што ў аўтара ёсьць здольнасьці сакавітай жывой мовай перадаць факты, намаляваць вобразы паасобных людзей. Але, з другога боку, яны паказваюць няўмельства глыбока, усебакова распрацаваць узятую тэму, сынтэзаваць паасобныя факты, ускрыць клясавую сутнасьць падзей, што асабліва выяўляецца ў такім творы, як «Неспакойны чалавек», дзе аўтар замест ускрыцьця складанага пераплёту клясавай барацьбы на вёсцы схэматычна толькі ўспамінае пра калектывізацыю.

На пытаньні савецкага тэатру, барацьбу за сапраўдны палітычны заво страны высока-мастацкі спэктакль газэта зварачвала дастатковую ўвагу. Пра гэта сьведчыць шэраг артыкулаў, рэцэнзій, зьмешчаных як у літстаронцы, таксама і наогул у газэце, Але асаблівая ўвага аддавалася самадзейнаму мастацтву, трамаўскаму руху. Побач з артыкуламі, якія мабілізавалі ўвагу пралетарскай грамадзкасьці Гомелю вакол гэтага пытаньня, артыкулаў, якія ўскрываюць недахопы творчай працы ТРАМ'у, у кастрычніку 1931 г. у сувязі з працай ТРАМ'у над пастаноўкай «Першая перамога» пры рэдакцыі адбылося абгаварэньне гэтай п'есы, вышла спэцыяльная літстаронка. Правільна ацаніўшы п'есу «Першая перамога», як практычнае ажыцьцяўленьне заклiку ўдарнікаў ў літаратуру (п'еса напісана маладымі рабочымі), з ўсёй яскравасьцю падкрэсьліўшы тое, што яна зьяўляецца прадуктам калектыўнае працы саміх трамаўцаў, адзначыўшы цэлы шэраг недахопаў п'есы, літстаронка ўсё-ж такі дапусьціла значную памылку, не падкрэсьліўшы, неабходнасьці самага рашучага зьнішчэньня гэтых недахопаў, з ўсёй рашучасьцю не папярэдзіла трамаўцаў аб тым, што гэтыя недахопы, калі ня будуць сваечасова зьнішчаны, у спэктаклі могуць перарасьці ў буйнейшыя палітычныя памылкі. Так яно і здарылася. Пра гэта яскрава сьведчыць артыкул тав. Модэля, які аналізуе трамаўскі спэктакль. З гэтай асноўнай памылкі літстаронкі вынікае і тое, што яна не раскрытыкавала хвалебны артыкул т. Лунца (былога кіраўніка ТРАМ'у). Літстаронка робіць памылку таксама і тады, калі не высьвятляе ўсіх фармалісцкіх установак мастака Панфілава па пытаньнях дэкарацыйнага афармленьня будучага спэктаклю.

Асабліва слаба ў разгледжаных літстаронках пастаўлены разьдзел крытыкі мастацкай творчасьці, распрацоўка, пытаньняў па літаратуразнаўству, бібліяграфія. Аддзел кансультацыі пачынаючых пісьменьнікаў пакідае ўражаньне нечага выпадкавага: выпадковыя адказы на выпадкова дасланыя творы. З гэтага аддзелу ня відаць сур'ёзнае работы з пачынаючымі таварышамі, ня відаць таго, якая-ж ім аказваецца дапамога ў творчых пытаньнях, не паказваецца вынікаў гэтай дапамогі. Пытаньні літаратурнага жыцьця Беларусі, заклік ударнікаў у літаратуру і тое, як ён праходзіць па Гомелі, работа літгурткоў, агляд камсамольска-маладзёжнай літаратуры— усё гэтыя пытаньні слаба распрацаваны ў літстаронцы, яны яшчэ чакаюць свайго вырашэньня.

Апошнія дзьве літстаронкі прысьвечаны распрацоўцы пастаноў партыі пра перабудову ліатратурна-мастацкіх арганізацый, канкрэтна вызначаюць далейшыя шляхі, па якіх павінна ісьці ўся работа гомельскага аддзяленьня саюзу савецкіх пісьменьнікаў, служыць паказальнікам таго, што савецкія пісьменьнікі Гомелю з ўсёй бальшавіцкай настойлівасьцю будуць змагацца за тое, каб даць творы, вартыя нашай эпохі.

Ал Случанскі

І тэлескоп не дапаможа

Я пэўна радзіўся
з душой не паэта.
(Першыя радкі рэцэнзуемае кніжкі).

Назва зборніка Ананьева «Гэроіка дзён» шмат да чаго абавязвае. І ўсё-ж трэба прызнаць, што пад гэтай назвай прыкрыта самая адшліфаваная (калі такая можа быць) чырвоная халтура. Давядзём.

Аўтар «мусіў паехаць» на «поўлзень далёкі» працаваць у шахты. «Часы праляталі ў нястрыманым русе» і аўтар, пакінуўшы шахту, зьвяртаецца на Беларусь. «І ніжуцца думкі цяпер на паро пра вугаль, жалеза пра сьпеў шасьцярон».

Якія-ж думкі ніжуцца ў аўтара?

Па аўтару—работа на шахтах—гэта работа блізкая да падняволь най, якая забірае апошнія сілы, якая забірае (у выглядзе нейкай «паэзіі») юнацтва.

У змаганьні за вугаль,
у змаганьні за кокс
аддаў сінь вачэй я,
аддаў чырвань шчок.
Адчуў, зразумеў я
пульс рудніка скора
і выгляд улушны
на тварах шахцёраў («Права на песьні»).

У наступных вершах фарбы згушчаюцца:

Надта парна...
дыхаць проста нечым...
завіліся ў кольцы дым і ціш.
А за шахтаю смуглявы вечар
пад павекі вочы закаціў (жах! А. С.).
Чад... Сьлякота.:. Кісла і смуродна...

Да таго аўтар сьцьвярджае яшчэ, што «мы з-зары працуем да зары». Дзе-ж ахова працы, дзе 6-гадзінны рабочы дзень, які забясьпечвае рабочаму патрэбны і культурны адпачынак? Аўтар з-за блізарукасьці прагледзеў тыя ўмовы і абстаноўку работы ў пэрыяд будаўніцтва сацыялізму, якія вызвалілі рабочага з ланцугоў паднявольнай працы, у якіх раней рабочы—аўтаматычны мэханізм, прыдатак да машыны—ператварыўся ў сьвядомага будаўніка.

Нашае будаўніцтва, па аўтару, вядзецца выключна сілай мускулаў:

Ён прыходзіць у ліцейны з першых,
сілу мускул (да таго няпісьменнасьць)
у працу пераліць (стар. 12).
Галасуем мускулам прывычным (стар. 14).
Учора бацька,
сёньня першым сын
галасуем мускулам за тэмпы (стар. 39).

Аўтар адкідае клясавую ўсьвядомленасьць (осознаность) працы, як справы гонару, мужнасьці і геройства, яго героі пазбаўлены разуменьня клясавай накіраванасьці працы.

Аўтарскае прыспасабленцтва ідзе глыбей. Ударнік для аўтара—гэта нейкі «тата» (тэрмін Ананьнева) з «пажоўклым абліччам».

Мы даўно яго ўжо «татам» клічам
замест проста (фраза чаго варта! А. С.)
«дзядзька Левінсон».

Клясавай сутнасьці ўдарніцтва аўтар даць ня можа. Ён бярэ ў кар'ер: вось ягоны герой зьмагаецца за Сіваш, і тут-жа, у наступным радку—

Зараз мы яго прэміравалі
і ўдарнікам пачалі зваць (стар. 12).

Ударнік для Ананьнева—абраз, фэтыш. Прыспасабленцтва і сюсюканьне не знаходзіць берагоў:

Дораг нам ён з лысінай антычнай (?)
да старых мазутных нагавіц (?!) стар. 13).

Вульгарызаваны, дзяляцкі падыход і да пытаньняў тэматыкі нашай літаратуры:

Я чуў як сьпявала
гудкамі зямля,
а тэм ня было,
апрача—прамфінпляну (!?)

Вось верш «Мост на Гайне». «Прышлі нямаведама скуль (чаму «нямаведама скуль?» А. С.) з прыладамі тры нятутэйшых (?)». Пачалі вылічваць і «адбайна мераць». Над Гайнаю—песьні плытагонаў. Аўтарская халтурка трапляе нават у нявінную, здавалася-б песьню плытагонаў:

А ты, Цецька, зноў аб Валі?
Кінь... Мы-ж хутка ў колгас.
Пачынай хутчэй дрыгаліць,
разуцеш на славу нас (стар. 16).

Ты, Пецька, са сваім каханьнем? Кінь, мы-ж хутка ў калгас! Ці патрэбны камэнтарыі да гэтай вульгарызацыі, пошласьці?

Будаўніцтва маста разгортваецца. Тэхнік Зайцаў робіць прамову:

Сябры,
мы ўзяліся старонкі лістаць
у гэту эпоху вялікую...

Слухайце, што гэты Ананьнеўскі Зайцаў гаворыць далей:

Нядбайства...
Прагулы, паніку,
енк
трэ зьмяніць захапленьнем,
упартасьцю...
Гэты загад вам, вядома, дае
наша ўлада і партыя (стар. 18).

Быць ударнікам, будаваць сацыялізм нашым працоўным улада і партыя, загадвае. Тут ужо халтуршчык Ананьнеў аб'ектыўна гаворыць вуснамі клясавага ворага. Ананьнеў скажае нашу рэчаіснасьць. Кіраўнічую ролю нашай партыі ён зводзіць да ролі адміністраваньня над рабочаю клясаю, да камандаваньня ею. У той час, як ідэя сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва нарадзілася ў нетрах самое рабочае клясы, у той час, як рабочая кляса з вялікім энтузіязмам сьвядома будуе сацыялізм пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў,—па Ананьневу, бачыце, ударніцтва зьявілася ў выніку адміністратарскага загаду з боку ўлады і партыі.

Ня спыняемся на праштампаваным тысячу разоў прыёме падачы ўспамінаў з грамадзянскай вайны, калі «змагары кулі ў байцы глыталі» і інш. і інш. Аўтар з цяжкасьцю зводзіць канцы з канцамі, канстатуючы:

Вялізны і новы мост ціхутка
грудзямі Гайну прыціснуў
(стар 23).

(І тут не абышлося без «арыгінальнасьці» з бязгустоўнаю прыправаю!).

Не пашанцавала ў паказе ўдарніка і ў вершы «Тамаш Рыгорыч». Пачынаецца з таго, што

У Тамаша Рыгорыча
ў ліцейным горача.

У Тамаша «за плячыма праляцеў табун гадоў», «барада стала белай, галаве больш ня трэба нажон (?)». Ён «быў пад Урангелем. Дужаўся з шляхтай». Вайна саветаў з польскім імпэрыялізмам бачыце гэта нейкае дужаньне. І ўся сутнасьць Тамаша, як ударніка, зьведзена да таго, што той свайму таварышу ў час працы ня даў закурыць...

У «Песьні будаўніцтва» (дзе, да рэчы, «вырастае ў будоўлі гмах, вырастае з гмахаў пяцігодка»—мы-ж да гэтуль лічылі, што гмахі вырастаюць на аснове плянаў пяцігодкі, але-ж гэта між іншым)—агульшчына, крыклівасьць, нязграбна-вершаваная чачотка:

Хто стрымае творчы дух камсы (?)
хто пашкодзіць узрастаць антэнам?

...Малаткі ў скоках. Навакол
беларусы, латышы, палякі.
Гэта ты—бадзёры камсамол
барацьбу ўзьняў за якасьць?

І далей:

Пад варштатам стружкі шалясьцяць,
гул трансмісій льлецца ў акордах.
Сярод працы, як сярод жыцьця,
(а праца—ня жыцьцё?).
Бачу я стаіш ты першы, горды.
. . . .
Нам бадзёрасьць сёньня ня купляць,
нам бадзёрасьць ня згубіць у полі.
Выяжджае камсамольцаў раць
на аблогі сёньня камсамоліць.
— Эх да хлопцы, песьню пачынай,
— Эх да, хлопцы, песьню аб машыне... (стар. 40).

Па форме звонка, а па сутнасьці—глупства. Ідэйная пустата. Мастацкая бездапаможнасьць.

Ананьнеў даходзіць да бязглуздзіцы:

Калі ласка, толькі бяз прычын,
аб'ектыўнасьць выкарчуйце жорстка! (стар. 44).

Называецца, папаў пальцам у неба!

Вершык — «Маналёг трактарыстаў» зроблены пад Сьвятлоўскую «Грэнаду».

Ідзем мы палі
Ўстрывожыць ад сну.
Вітай, вясна, трактар,
а трактар вясну.
І коняй ідзем мы,
машынай зьмяніць.
Ты што, паасобнік,
прыстаў на кані?
Глядзі, як мы зараз!
Матор запяяў:
«Камуна, камуна,
Камуна мая» і г. д. і г. д.
(стар. 47).

У адносінах да гэтай халтуркі трэба ўнесьці карэктыву. Маналёг належыць не трактарыстам. Гэта маналёг Ананьнева.

У разьдзеле «Старому апошнія хвілі» ёсьць верш «Гнеўны допыт», а ў ім наступныя радкі:

У нашай краіне над самай Масквой
бы хмара плыве з небакраю...
Давайце... Давайце хутчэй тэлескоп—
убачу я чорную зграю! (стар. 51).

Гэта значыць—«хутчэй дайце тэлескоп і я ўгледжу зграю клясавых ворагаў шкоднікаў, рамзіных і ім падобных». І напэўна Ананьневу тэлескопы ў свой час не падалі: клясавая сутнасьць шкодніцтва вершам ня выкрыта. У вусны Рамзіна і інш. шкоднікаў укладваюцца зусім выпадковыя маналёгі, якія іх не характарызуюць і ня могуць характарызаваць.

Як бледна выходзіць, якое вялікае неразуменьне нашай эпохі, якая бяздапаможнасьць у паказе нашай эпохі мастацкімі вобразамі!

На аснове гэтых кароткіх заўваг наконт кніжкі »Гэроіка дзён» трэба зрабіць наступнае падагульненьне. Вершаваная творчасьць кніжкі сьведчыць пра надзвычайна нізкі ўзровень сьветапогляду яе аўтара, падкрэсьлівае тое, як чырвоная халтура прыводзіць да вялікіх палітычных памылак і зрываў, як яна становіцца шкоднаю для нашай літаратуры.

Халтурная кніжка «Гэроіка дзён» выдадзена ў 1932 г. Рэдактар яе на адвароце тытульнага ліста чамусьці не паказаны. Мала таго, разгледжаная «творчасьць» пасьпела ўжо выйсьці ў другім выданьні. Абодва-ж выданьні гэтае чырвонае халтуры выдала Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі на працягу 1932 г.

Голая патэтыка і „казачныя фэі“

Т. ХАДКЕВІЧ. „Сьмялей, таварыш“. ДВБ 1932 г. ц. 80 кап

Для таго, каб выйсьці з друку зборніку вершаў Хадкевіча спатрэбілася некалькі гадоў. І ня дзіва, што зборнік зьявіўшыся на сьвет у 1932 г. (а вершы напісаныя 3-4 гады нату назад) на шмат адстаў ад нашага дня, пэўным чынам устарэў, як сваёю тэматыкаю так і сваім мастацкім выкананьнем.

Вершы Хадкевіча--аптымістычныя песьні маладога паэта-камсамольца. Моцна адчуваецца арганічная сувязь маладога паэта з «камсамольскай братвой», з тым, што вясёлае і бадзёрае з тым, што сьмела глядзіць наперад.

Асноўным недахопам вершаў трэба лічыць іх абстрактнасьць, адсутнасьць канкрэтнай тэматыкі, гэта галоўным чынам «вершы наогул». Яны ні ў якай меры задаволіць нас на сёньняшні дзень ня могуць. Мастацкія сродкі—даволі заношаныя, сьцёртыя, ня могуць пахваліцца сьвежасьцю і арыгінальнасьцю.

Вершы пра сацыялістычнае будаўніцтва—агульныя, абстрактныя. Паэт часта насьледуе паэтам «Кузьніцы»:

Ідзе вялікі грозны Будаўнік
(з вялікай літары).
народжанай
Кастрычнікам эпохі (стар. 13).

Зусім зразумела, што пры такім падыходзе да нашай рэчаіснасьці нельга паказаць героя, ударніка сацыялістычнага будаўніцтва. Жадаючы-ж пераключыцца на канкрэтную тэматыку, аўтар ня ідзе далей голага плякатнага заклiку:

Ня церпіць час марудных рухаў
калі будынак не гатоў.
Хто ля станка свайго марудзіць,
злачынца і нядбайнік той (стар. 11).

У паказе рабочага гораду Хадкевіч, выхадзец з вёскі, бязсільны:

Праз вокны льлецца
гоман правадоў,
нібы на полі
шопат васільковы (стар. 16).

Значная частка вершаў зборніка прысьвечана камсамолу. Але і ў іх няма разгорнутага паказу штодзеннай работы і барацьбы ленінскага камсамолу на франтох сацыялістычнага будаўніцтва. Камсамол у ўяўленьні Хадкевіча гэта—вясёлая братва, якая адкідае ўсякую тугу, крышыць рэшткі старыны, гэта нейкая «моц свавольная». І ўсё.

К ліху адкінем пануры сум
к ліху мінулага звычаі.
Гэты запал не адзін я нясу
шэрагі нашы ня зьлічыш (стар. 28).

Вынікам неаформленасьці аўтарскага сьветапогляду ў вершах зьяўляецца пасывізм:

Я хачу ісьці змагацца
з перашкодамі цяпер.
Дайце больш разгорнай працы,
дайце і ёй бадзёры сьпеў (стар. 31).

Паэт яшчэ ня мае пэўнай творчай самастойнасьці. Прыкладам у вершы «Кімаўскай арміі» ён моцна насьледуе Маякоўскаму:

Хто там чало нахмурыў,
Хто там
таіцца пужліва?
Сёньня настрой, як бура,
сьпеў агнявы і шумлівы, (стар. 24).

У інтымнай лірыцы Хадкевіч зрываецца да простай ідэалізацыі мяшчанскае ўтульнасьці, «нежнага (?) сьпеву гітары», «таемных гулаў» і інш. Паказальным у гэтым сэнсе зьяўляецца верш «Адыход». Аўтар суб'ектыўна жадае парваць з мяшчанскім асяродзьдзем. На справе-ж гэтае-ж асяродзьдзе моцна ўплывае на аўтара, прымушае паэта ідэалізаваць яго. Чым як не ідэалізацыяй мяшчанскага побыту гучаць наступныя строфы:

Тут гітары кволы веяць
незнаёмы для мяне.
Моўчкі казачныя фэі
задрамалі на сьцяне (?!)
Тут здаўна ўют (?) прыветны
арамат (?) былога льле.
Сярод хатніх пышных кветак
цішыня паклала сьлед.
Тут узорныя фіранкі,
старамодныя каўры.
Цень глухая дагарае
аджываючы пары (стар. 47).

Ня гледзячы на тое, што гэтая абстаноўка аджывае, у паэта ўсё-ж вырываюцца словы, вобразы для яе салодкага апісаньня. У вершах з вясковай тэматыкай Хадкевіч канстатуе, што «бачыце, сяляне палюбілі сёньня жыць магутным калектывам» (стар. 56) Далей гэтага аўтар ня ідзе. Паказу жыцьця ў калгасах мы нязнойдзем. Замест гэтага аўтар часта скачваецца да лякіроўкі:

І пад гэты гоман хмуры
пад пакровам (?) вечароў
урачыстасьцю камуна
зіхаціць каля дуброў (стар. 66).

Адсутнасьць глыбокага падыходу да пытаньняў перабудовы сельскай гаспадаркі прыводзіць да неперажанальнай агіткі («Даеш калектыў» «Грамадзянін Шалуха»—верш пра правінцыянальнага абывацеля, справавода аднэй установы, прадстаўніка былых людзей. Гэта абязброены эпохай чалавек, пасыўны ў дзеяньнях, але які ўсё-ж жыве «мінулым, як жыватворчаю расой».

Зборнік «Сьмялей, таварыш» дэманструе сваё адставаньне ад задач сёньняшняга дня. Гэта ставіць перад ягоным аўтарам задачу пераключэньня на канкрэтную тэматыку сацыялістычнага будаўніцтва праз аўладаньне сьветапоглядам пралетарыяту.

А. С.

Тэатральная хроніка

Латышскі тэатр у Менску.

У БССР прыехаў з Масквы дзяржаўны латышскі тэатр РСФСР для абслугоўваньня працоўных латышоў Менску і шэрагу раёнаў.

13 і 14 ліпеня адбыліся першыя пастаноўкі ў нацыянальным латыскім клюбе імя Розы Люксэмбург.

Будуецца новы вялікі тэатр

11 ліпеня адбылася закладка будынку вялікага тэатру ў Менску. Тэатр разьлічаны на 2250 чалавек і будзе будавацца на пляцы Парыскай Камуны. Пабудова тэатру будзе скончана ў першай палове 1934 году.

БДзТ-3 ў Віцебску

У сакавіку месяцы БДзТ-3 распачаў працу ў Віцебску пастаноўкай пе'сы «Энтузіясты».

Ня з меншым посьпехам прайшлі пастаноўкі п'ес «Дыктатура»— Мікітэнкі і «Віхор»—Сташэўскага.

Тэатр закончыў свой сэзон п'есай Курдзіна—«Контратака», пасьля чаго выехаў для абслугоўваньня Бел ДРЭС, Асінторфу і Дубровенскай мануфактуры.

Зараз тэатр працуе на новапабудовах раёну Воршы.

К. Губарэвіч

Галоднае Жыцьцё

(Урывак з аповесьці)

У абедзены перапынак у чарцёжную да Вэрнэра і Галі прышоў Пагэль—майстар-токар і фрэзэроўшчык Мартынсон. Абое (Пагэль — з Гамбургу, Мартынсон—з Эссэну) у мінулым годзе прыехалі ў СССР шукаць работы і засталіся тут на заводзе. Па росту яны самыя працавітыя людзі. Мартынсон высокі сухарлявы, далёка ўжо не хлапец, з глыбокімі павольнымі вачыма, быццам кожная рэч яму незнаёмая была. Пагэль—маленькі, рухавы гадоў пад 50. Рэдкія і сівыя бровы яго былі заўсёды ўзьняты, як у чалавека, каторы ўвесь час зьдзіўлены нечым. Шырока адкрытыя бліскучыя вочкі казалі аб шчырасьці і славахвотлівасьці старога чалавека.

Абодвым Вэрнэр далікатна прапанаваў крэслы. Мартынсон лічыў нетактычным сядзець каля чарцяжоў чужой машыны і крэслы ён аднёс ад вакна далей ад сталоў. Вэрнэр пачаў нешта казаць па-нямецку, але Пагель катэгарычна запратэставаў: па-першае—трэба паважаць прысутнасьць свайго калегі—інжынэра (Пагэль прывітальна кіўнуў Галі галавой), а па-другое яны ўжо добра валодаюць іхняй мовай. Вэрнэр няёмка змоўк, вінавата зірнуўшы на Галю.

— Вы ня былі сёньня ў таку?—Здалёк запытаўся Мартынсон.

— Не...

— О,—нястрымаў Пагель. Многазначна зацягнуўся сыгарэткай узьняўшы на Вэрнэра бровы.

— Вы там сёньня непамерная сэнсацыя... Аб вашых канструкцыях выдрукавалі ў сёньняшніх газэтах, так... а выразныя карэспандэнцыі наклеілі да сьцен...

— Вэрнэр шчэ ў раньні чытаў гэтыя карэспандэнцыі. З радасьцю бегаў з газэтаю да Галі дамоў.

Ён прыехаў поплеч з Пагэлем і так сама закурыў.

— І вось мы прышлі першыя вітаць вас, як чалавека аднэй айчыны і нацыі...

Шчыра і нясутрымна зарагатаў Вэрнэр Пагэлю ў твар. Сьмех сарваўся як кашаль ад захлупнелага дыму ў грудзёх. І цяжка было зразумець, што перамагае: Кашаль ці сьмех...

— Кіньце, Пагэль... Вэтнэр выцер мімавольна сьлёзы.

— Вы яшчэ не забываеце сваю «айчыну і нацыю»... Кіньце. Сапраўдная айчына і нацыя для нас тут, у СССР...

— Ну, усё-ткі....

— Канечна- па-першае—ніхто з нас ня думае ўжо вярнуцца да свае айчыны і нацыі, а па-другое...

Вэрнэр павольна ўзьняўся з крэсла і зноў сталі цьвярдымі яго рэзкія, вуглаватыя абрысы твару.

— ...Шчэ ні адна айчына не хваліла мяне так, як гэта...

— Вось вы кажаце аб маёй сэнсацыі на заводзе.., і вы бачыце, як дрыжаць мае рукі...

Вэрнэр выцягнуў перад вачыма Пагэля жыламастыя пальцы. Між імі дрыжэла цыгарка і попел сыпаўся Пагэлю на калена.

— Я хвалююся. Бо рады, што нарэшце я стаў патрэбны ў жыцьці—абярнуўся да вакна і неспакойнымі вачыма ўгледзіўся на двор.

— Так...—парушыў сваю маўклівасьць Мартынсон. З мэтадычнай акуратнасьцю ён затушыў акурак і аднёс яго ў попельніцу на стале.

— Вам, гэносэ Кунф, ёсьць завошта хваляваціца і радавацца... Я думаю, што вашы канструкцыі надоўга забясьпечаць вам жыцьцё...

— Што?..—нездагадліва азірнуўся Вэрнэр.

— Ну... колькі вам плацяць за іх?..

— Ні пфэніга...

— О!—разам зьдзівіліся Мартынсон з Пагэлям, хоць і ведалі ўжо аб гэтым.

— Так, я адмовіўся ад выплаты...

— Абсалютна незразумела...

— Я думаю, што ня мне, а я зараз павінен адплаціць савецкім рабочым, што яны далі мне прытулак ад жудасьці капіталістычнага крызісу...

Мартынсон і Пагэль няёўка апусьцілі вочы на свае бацінкі. Пэўна парашылі, што Вэрнэр нагадвае і на іх адплату... Але ў Мартынсона было свае непераможнае адпраўданьне. Жыцьцё кожнага чалавека Мартынсон падзяляў на дзьве часткі. У першай—цаной пакуты, змаганьня, цаной страты сілы, чалавек замацоўвае сваю асобу ў жыцьці, у другой—спажывае здабытае барацьбой, як спажывае садоўнік садавіну ад вырашчанага саду, як інжынэр—даход ад запатэнтаванага свайго вынаходцтва... Форд, Крупп, Крэйгер славутыя тым, што ў першую палову свайго жыцьця яны вынайшлі багата ідэй... Цяпер яны жывуць на капіталы тых ідэй. Ідэі трэба прадаваць, а ня кідацца імі...

— Вы, Кунф, зараз працуеце над вялікай канструкцыяй замежных аўтаматаў... Гэта ваша ідэя... Але вы яшчэ молады і няведаеце таго, што праз некалькі год няздолееце ўжо раджаць рэнтабэльныя ідэі і будзеце вымушаны жыць толькі працай сваіх зьнясіленых рук...

Мартынсон увесь час стаяў супроць Вэрнэра ўпэўнены і непераможны ў сваіх перакананьнях.

— Вы шчэ мабыць ажэніцеся (Вэрнэр парумавеў і з потайку зірнуў на Галю), а гэта яшчэ большую адказнасьць ўскладае на вас...

— Вялікую адказнасьць... — шчыра ўздыхнуў Пагэль.

— І акрамя ўсяго, вы рабіце некалегіяльна... Я тож думаю прапанаваць за воду адно вялікае рацыяналізатарскае мерапрыёмства, але пасьля вас я проста ня ведаю... Ня ведаю проста... мы прышлі прасіць вас, каб вы падумалі..: Разгублены Мартынсон нездаволена варснуў на галаву капялюш.

— Падумайце, гэносэ Кунф...

Быццам пакрыўджаны і раскратаны Мартынсон пайшоў з Пагелем за дзьверы. Толькі цяпер здагадаўся Вэрнэр аб сапраўднай прычыне іх прыходу. Ён доўга стаяў пасярод пакою, гледзячы ім усьлед. Галя несчакала, пакуль ён атоўпіцца. Кранула яго за плячо:

— Канчайце работу Вэрнэр...

Але ён стаяў, як аглушаны. Пасьля з глыбокай задуманасьцю падышоў да свайго стала. Няма ведама навошта перасунуў рэйшыну. Кінуў рэйшыну і ўзяўся перабіраць цыркулі. Галя бачыла, што ні тое, ні другое зараз яму ня трэ было. Але, пэўна, трэ было сканцэнтраваць думкі рассыпаныя, як бульба з кошыка на нечакана крытым павароце. Галя чакала пакуль Вэрнэр зьвернецца да яе, каб дапамагла пазбіраць іх. Маўчаў Вэрнэр. Увесь астатак дню з напруджана-сьцятай маўклівасьцю ён вырашаў нешта. Цьмяныя ўпадзіны шчок набрынялі потам. Пэўна думкі і праца ня ішлі поплеч. Галя бачыла, што Вэрнэр як мага хутчэй намагаецца скончыць працу. Мабыць—пасьля думаць лягчэй. Перад вечарам ён выпрастаўся над сваім сталом высокі, сутулены. Выцер пот і асьвятліўся шчасьлівай радаснай усьмешкай. Скончыў самы апошні этап работы—касакутную праэкцыю. Галя ўжо заканчвала фасад машыны.

— Гох!..—узбуджана варснула ад сябе Галя лінейкі.

— Вэрнэр, крычэце—гох!.. Скончылі...

Вэрнэр спачатку прагледзіў закончаны фасад, потым з шчырай падзякай доўга паціскаў Галіну далонь.

Праўда, ад усхваляванасьці. ён ня мог сказаць многа слоў у падзяку, за тое палінелыя вочы мілавалі Галю за яе дапамогу ў такой цяжкой і складанай працы над канструкцыямі. Цяпер бы толькі трэстаўская экспэртыза і хутчэй пробную мадэль.

— Тады, вы Гален, зусім ня будзеце сумнявацца ў посьпеху... Ох, вы... опортуністышэн..:

— Ну вас... колькі разоў вучыла праўільна вымаўляць...

Галя адчувала прыкрую няёмкасьць пасьля закончанай працы, у якой яна адкрыта сумнявалася перад Вэрнэрам. Цяпер Галя ўшчула да яго цёплую павагу. Ён мабыць і не сумняваўся, так як Галя, у посьпеху, пэўна і думкі такой ня было. У Галі зьнікла заўсёдашняя ахвота жартаўлівасьці. Яму бліжэй была шчырая, як і сам ён шчыры, таварыская адкрытасьць. У адказ яна таксама паціснула буйную руку Вэрнэра. Хацела ўзяць з сабою дамоў чарцяжы, каб хутчэй прааналізаваць іх для дакладу на вытворчай нарадзе. Каб хутчэй сказаць усяму заводу аб непераможнай дужасьці творцы гэтае ідэі. Вэрнэр далікатна адабраў у Галі чарцяжы і склаў іх у шафу. Не раў часта аджыжалецца такой складанай працай. На сёньняшні вечар яны вольныя. На двары ён узяў Галю пад ручку (і ўжо не за локаць, а крыху вышэй). Зноў Вэрнэр нечакана змоўк. Зьнікла з твару шчасьлівая мімітычная схваляванасьць. Мабыць успомніў Мартынсона, яго просьбу падумаць... Не згаварваліся, але абое прайшлі праз невялічкі малады парк у поле. Маўчалі. Галі думалася, што Вэрнэр проста адпачывае на волі вясеньняга поля. І сама выпрасталася ў плячо, каб лягчэй удыхаць густое зямлянае паветра. Нават прыемней было моўчкі слухаць палявое зацішша, ісьці і адчуваць пад нагамі парную сакавітую зямлю. Каля дарогі ляжала невялічкая гурма бярвеньня. Трэба думаць, што ўзімку нехта вёз яго да заводу, але конь забухаўся ў сьнег і вывернутыя з саней бярвеньне засталося тут да вясны. Вэрнэр спыніўся ля яго. Запасным насавікам (ён заўсёды насіў яго ў бакавой кішэні партплэду) акуратна абмахнуў дубовае бервяно. Папрасіў Галю сесьці і сам прымасьціўся поплеч. Доўга расьціраў далоняй цьвярдыя складкі на лбу, быццам слухаў штосьці няпрыемнае.

— Не хачу я слухаць Мартынсона!.. — адмахнуўся Вэрнэр, невядома каму адгрызнуўшыся... Цяпер толькі заўважыла Галя, што маўклівасьць яго было ні што іншае, як шляская нутраная сварка з Мартынсонам.

— Вы і няслухайце...—проста параіла Галя.

— Гэта ня так проста Гален... У прынцыпе Мартынсон праў...

— Вы сур'ёзна?..

— Так... калі глыбей зірнуць, дык яго словы бяспрэчная ісьціна...

Вэрнэр уздыхнуў.

— Кожны чалавек у сапраўднасьці намагаецца забясьпечыць другую палову свайго жыцьця...

— Так... самі, Гален ведаеце: сустракаецца жанчына, яна заўсёды патрабуе жыцьцёвае сталасьці... Сям'я...

— Уой... — нястрымалася нарэшце Галя.

— Выходзіць—усё жыцьцё за сямейны спакойны прытулак?.. Ну і бюргер вы...—сур'ёзна і дакорліва ўздыхнула Галя.

— Па вашаму выходзіць, што жыцьцё гэта акцыянэрная фірма... Сёньня ўклаў акцыі—заўтра атрымаў дэвідэнты...

— Глупства Вэрнэр... Гэта тэорыя ад страху беспрацоўя і незабясьпечанасьці індывідуальнай асобы ў капіталістычнай сыстэме... І Мартынсон з Пагэлем ніяк шчэ не апрастаецца ад таго страху, таму і кажуць так...

Вэрнэр нярухома слухаў словы, выціраў пальцы, спацелыя ад усхваляванасьці.

— А мы жывём у адказнасьці адзін за другога і ня дрыжым за другую палову свайго жыцьця... Жанчына наша таксама ня менш турбуецца аб сваёй жыцьцёвай сталасьці і ведаеце...

Галя з цёплай праніклаcьцю наблізілася да Вэрнэра:

— У большасьці яна не чакае жыцьцёвае сталасьці мужчыны, а сыходзіцца, каб разам дамагацца яе... А вы зьніжаеце жанчыну да нейкае паразытнае істоты...

— Вось гэта ўжо дарэмна!.. — з болем крыўды ўзрушыўся Вэрнэр.

— Вы ня маеце права. Гален, казаць так, бо шчэ мала разумееце мяне...

— Магчыма...

— Некаторы час Вэрнэр проста задыхаўся ад узбуджанасьці. Цяпер Галя бачыла што ні толькі ўпікнула яго, колькі абразіла.

— Даруйце Вэрнэр...—Галя вінавата ўзяла яго за далонь.

— Ня ў тым справа, Гален...—ён мімаволі затрымаў яе руку, напруджана шукаючы нешта ў сваёй памяці. Справа ў тым. што вось ужо чацьвёрты год Вэрнэр ня ведае жанчыны-таварыша і сумеснага змагальніка. Тры гады беспрацоўны Вэрнэр блукаўся з Данцыгу ў Гамбург, з Гамбургу ў Бэрлін. Тры гады самай патрабавальнай і дужай маладосьці... Ну, канечна, часовыя сустрэчы былі. Сустракаўся так, як сустракаецца двое дарожнікаў. Застановяцца, каб закурыць ці спытацца дарогі, і разыходзяцца кожны сваім шляхам, каб хутчэй дацягнуцца да якога прытулку... Ці мог Вэрнэр думаць аб сумеснай дарозе?—Думаць нават страшна было. Ён бачыў, як бацькі часта пакідалі свае сем'і і ішлі блукаць па гарадох у пошуках хоць часовага заробку. Маладыя жонкі ў цёмных нішах пад'езду прапанавалі вуліцы свае недарагое (вельмі недарагое!) каханьне. І Вэрнэр ня думаў—аб чым не хацелася думаць.

Але за кароткі час свайго жыцьця тут Вэрнэр пачаў думаць іначай (Галя несьцярожліва адсунулася крыху). Не. Навошта так разумець Вэрнэра. Ня проста сыйціся для часовай узаемнасьці, не. Гэта Вэрнэр колькі хочаш мог знайсьці ў Гамбурскіх партовых кварталах і на любой вуліцы Бэрліну (ня дорага). Але не аб тым кажа Вэрнэр. Сярод гэтых людзей, сярод гэтай творчасьці мімаволі хочацца адчуваць поўнасьць чалавечага жыцьця: блізкую жанчыну-таварыша (не паразыта, Гален!), сям'ю, за якую ня будзеш дрыжэць перад кожным новым невядомым днём... Так... Хочацца адчуваць, хочацца набракнуць сокамі цікавага чалавечага жыцьця, як прагне набракнуць вадой галодны сухмень зямлі...

— Чалавек, які ачуняе—галодны і непамерна багата хоча есьці... Я таксама адчуняю і таму галодны... я не памерна багата хачу ўвабраць у сябе жыцьця... Вэрнэр перадыхнуў ад доўгіх ускалываючых слоў.

— Зразумейце мяне, Гален... Тым болей, што і вас я ня лічу паразытам...—Вэрнэр зразумець прасіў. І ня толькі словамі. Цяпер маўчаў ён, а глыбока дапытлівыя вочы болей слоў прасілі яе... Галя чуе на сваёй руцэ лёгкія ўздрыгі пальцаў яго. Недзе здалёк да гураду імчаўся цягнік. Чутна, як дрыжыць зямля, зьнясіленая жывёліна, на кую імчыцца ашчэраны зьвер. Галя пацягнула сваю руку. Вэрнэр шчэ мацней сьціснуў яе гарачымі пальцамі... Мімаволі і нясутрымна задрыжэла Галя, як тая зямля. Імчыцца цягнік. Напорны, узрушаны Вэрнэр чакае, просіць зноў яе. Маўчала Галя, пакуль прайшоў цягнік і супакоілася зямля. Потым ціха ўзьнялася і ўзяла Вэрнэра за другую руку:

— Холадна, Вэрнэр, пойдзем...

П. Скокаў

Навагоднi сказ паэта

(Пра кнігу С. Ліхадзіеўскага „Мы маладая гвардыя“)

Толькі тога
эпоха пры́ме,
хто ў паэзіі—
бальшавік!

Сьцяпан Ліхадзіеўскі ўвайшоў у беларускую літаратуру ў перыяд сацыялістычнага будаўніцтва народнай гаспадаркі і культуры БССР. За свой невялікі тэрмін літаратурнай работы С. Ліхадзіеўскі здолеў стаць у шэрагі актыву творцаў мастацкай літаратуры пра камсамол і моладзь, змог даць шэраг твораў, якія з партыйнага пункту гледжаньня паказваюць жыцьцё і работу рабочай і калгаснай моладзі, вырашаюць праблемы, якія перад моладзьдзю паставіла партыя і камсамол.

Яшчэ ў першых зборніках сваіх вершаў: «Чырванеюць вішні», «Рокаты дальняй прыстані» і інш., Ліхадзіеўскі азнаёміў сябе з чытачом, як маладзежны паэт, якога пад кіраўніцтвам партыі выхоўвае ленінскі камсамол. Праўда, першыя крокі паэта не пазбаўлены творчых зрываў, паасобных памылак. Прычынай гэтаму зьяўляецца слабая тэарэтычная падрыхтоўка аўтара першых зборнікаў, слабае аўладаньне мэтадам дыялектычнага матарыялізму ў падыходзе да нашай вялікай рэчаіснасьці. Затое далейшы рост паэты ідзе па шляху ўпартага змаганьня за падвышэньне свайго ідэйнага ўзроўню, за аўладаньне сьветапоглядам пралетарыяту. Красамоўным доказам гэтага зьявіўся апошні зборнік вершаў С. Ліхадзіеўскага «Мы маладая гвардыя» *).

Калі ў творчым пляне першых зборнікаў, аўтара чырвонай ніткай праходзіла жыцьцё і праца ў пераважнасьці калгаснай моладзі—выкананьне ўдарнымі тэмпамі плянаў будаўніцтва ў калгасе, роля камсамолу, моладзі ў калгаснай рабоце, узьняцьце клясавай пільнасьці, раскрыцьцё плянаў клясавага ворага, дык зборнік вершаў «Мы маладая гвардыя» амаль поўнасьцю накіраваны на вырашэньне праблемы інтэрнацыянальнага выхаваньня шэрагаў камсамолу і рабочай моладзі, на выхаваньне будучых бальшавікоў.

Калі ў папярэдніх вершах творчая лінія Ліхадзіеўскага акрэсьліваецца вырашэньнем паасобных праблем жыцьця і барацьбы моладзі, часта без неабходнай непасрэднай сувязі з астатнімі праблемамі камсамольскай работы (гл. вершы з кніг «Рокаты дальняй прыстані» і «Крывавыя зьнічкі на сьневе»), дык зараз пастаноўка і вырашэньне задач інтэрнацыянальнай еднасьці моладзі трактуецца аўтарам у пляне перабудовы ўсёй работы саюзу, ўзьняцьця яго гаспадарча-культурнай дзейнасьці, паглыбленьня палітыка-

выхаваўчай работы, падпарадкаваньня высока-прынцыповым задачам бальшавіцкага выхаваньня моладзі. У вершах з кнігі «Мы маладая гвардыя» аўтар пайшоў па лініі глыбокага пераадоленьня схэматызму, спрошчанасьці ў падыходзе да вырашэньня маладзёжных праблем. У дадзеным выпадку моладзь бярэцца не ізалявана ад усёй рабочай клясы, не як сіла, якая вырашае задачы прынцыпова розныя ад агульных задач рабочай клясы.

Камсамол, у разуменьні Ліхадзіеўскага, стоячы на баявых пастох, добра ведае, што ў тылу і ў перадавых шэрагах клясавага ворага спакою няма, клясавыя ворагі «пілюляй шрапнэлі хочуць нас частаваць».

У сваёй рэвалюцыйнай практыцы камсамольцы «выносілі голаду стынь», баранілі бацькаўшчыну пралетарыяту. Гэта былі гады, калі:

Прарывалі і бралі франты
зрубцаваныя нашы браты.
Нашы сёстры ішлі з двара,
забінтоўвалі горач ран.

Пад кіраўніцтвам партыі—камсамол выходзіў і вышаў пераможцам з узброенай барацьбы ў Кастрычніку 1917 году. У барацьбе ён загартаваў сябе, набыў непамерную трываласьць.

І вось гэтую трываласьць ног
і па сёньня з нас кожны зьбярог,
гэты пульс агрубелых рук
і па сёньня наш поіць рух
Да вялікіх і творчых дзей.
Наша партыя нас вядзе.

Найбольш выразна Ліхадзіеўскі робіць мастацкае абагульненьне ў паказе сутнасьці маладых ленінцаў у сацыялістычнай будоўлі ў вершы «Нараджаецца новы герой». Маладыя рабочыя—

... сьнежнай поўначы лесаруб,
вынаходца мядзяных руд,
барацьбіт што ўзьнёс Днепрабуд
сын палескіх палёў—балот
і з пад Астрахані рыбалоў,
сын бязводных туркменскіх пустынь,
што скарыў і пустыню
і стынь,
зборшчык харкаўскіх трактароў,—
і рэспубліцы ўсе аддаюць
яны здатнасьць і руннасьць сваю,
аддаюць—
свае сэрцы і кроў!

Гэта ёсьць паэтызацыя гераізму той часткі працоўнай моладзі, якая пад кіраўніцтвам партыі аддае сваю моц, энэргію і здольнасьць сацыялістычнаму будаўніцтву.

Наш саюз, які працуе пад кіраўніцтвам УсеКП(б), павінен перадаць свой вопыт масава-палітычнай работы, бальшавіцкага выхаваньня моладзі брацкім сэкцыям, дапамагчы арганізаваць работу па-ленінску, выконваць пастаўленыя задачы. На вырашэньне гэтай задачы накіраваны вершы зборніка «Мы маладая гвардыя»—«Радзіма—краіна саветаў», «Заходня-беларускім камсамольцам», «Горад ня толькі горад маладых самагубцаў», «Голас абрабаваных», «Экспрэсы нянавісьці» і інш.

У вершы «Радзіма—краіна саветаў» С. Ліхадзіеўскі разгортвае мастацкі паказ перажываньняў камсамольцаў капіталістычнай Нямеччыны, якія прыехалі да нас, каб азнаёміцца з жыцьцём і работай моладзі Савецкай Беларусі.

Быў вечар сустрэчы...
казалі яны,
як Вэддынг чырвоны свой сьцяг
бараніў,
пра грукат абозаў чарговай вайны,
пра розгалас крыўды жыткёвых
ніў.

У шырокім знаёмстве з работай беларускіх камсамольцаў і моладзі, камсамольцы Нямеччыны пераканаліся ў выкананьні тых вялікіх задач, якія перад беларускім камсамолам ставіць КП(б)Б. Бачачы вялізарны вопыт работы нашага камсамолу, яго гераізм, энэргію ў сацыялістычнай будоўлі, малады нямецкі рабочы—сацыял-дэмакрат становіцца на шлях ленінскага камсамолу.

Вось гэты пераход на камсамольскія пазыцыі аўтарам паказаны ня досыць глыбока. Чытач ня бачыць усёй шматграннасьці перажываньняў маладога сацыял-дэмакрата, выкліканых азнаямленьнем з будаўніцтвам у СССР, з гераізмам камсамолу і моладзі ў змаганьні за пабудову сацыялізму. Не даецца аўтарам глыбокага аналізу перажываньняў, даецца простая заява: «Казалі—прыкрочаць яны да граніц краіну саветаў сваю бараніць!»

У другім вершы—«Заходня-беларускім камсамольцам» аўтар заклікае камсамольцаў Заходняй Беларусі—ўзарваць капіталістычны лад Польшчы. Гэта асноўная задача Заходня-беларускіх камсамольцаў. У крывавых боях камсамол не павінен адступіць ад выкананьня гэтай задачы. Аўтар піша:

Вы выходзіца, таварышы,
гэту жудзь узарваць, зварушыць!
Да баёў вас рашучых заве
акрываўлены сымбаль—«савет».
І мы з вамі адным жывём,
сэрцам родныя і крывёй!

Салдатаў капіталістычнай арміі паэт заклікае:

Салдаты! Рыхтуйце зброю!
Салдаты!
Вайна—вайне!

Нянавісьцю да капіталістычнага ўціску прасякнуты верш «Экспрэсы нянавісьці», у якім аўтар у мастацкіх вобразах дае паказ зьлейшых ворагаў пралетарыяту—фашыстаў, сацыял-дэмакратаў і іх прыхвасьняў.

Трэба сказаць, што поўнасьцю Ліхадзіеўскі яшчэ ня справіўся з ліквідацыяй схэматычнага падыходу да рэчаіснасьці. Нават некаторыя вершы рэцэнзуемага зборніку (гл. напрыклад вершы «Адбой», «Ну, дзяўчаты, не качай!») маюць гэты недахоп. У іх аўтар не бярэ ў цэнтр увагі галоўныя тэмы і ня робіць глыбокага аналізу. Усё-ж Ліхадзіеўскі ясна ўсьвядоміў свой далейшы шлях творчага разьвіцьця. «Толькі тога эпоха пры́ме, хто ў паэзіі — бальшавік»—гэта на сёньня баявая праграма для маладога паэта. Задача надалейшае крочыць па шляху аўладаньня сьветапоглядам пралетарыяту, аўладаньня маркса-ленінскай тэорыяй у вырашэньні праблем сацыялістычнага сёньня.

*) Выданьне ДзВБ, ЛіМ, Менск, 1932 г. Цана 1 р. 15 к.

Янка Палесіні

Лірыка вузкіх палеткаў

Зборнік вершаў Сяргея Дарожнага «Пракосы напамяць» +) гаворыць пра творчы рост паэты.

Аднак, аўтар яшчэ не парваў з матывамі ранейшай творчасьці, спадчына былога засталася ў яго зараз.

Радкі з «Уступнага слова»:

Табе аддаю я, рэспубліка, ўсё,
І голас мой сонцам наліты.
Я поплеч з табою
Крысо ў крысо
На штурмах эпохі вялікай!

— Гучаць фальшыва, не пераканаўча, яны гавораць, што Дарожны, як на нашае будаўніцтва, сучаснасьць «няўтомных ударнікаў» глядзіць з «Жураўлінага лёту». Акрамя таго, аўтар яшчэ жыве дробнабуржуазнымі тэндэнцыямі, абывацельскімі імкненьнямі мець «самы маленькі на сьвеце пакой», які быў-бы «па вушы паперай завален». Аўтар забывае на тое, што некалькі старонак назад называў сябе будаўніком, які ідзе «у ногу», поплеч з Рэспублікай» і апынуўшыся на ўлоньні «каханьня» забываецца на ўсё, нават губіць галаву і гаворыць:

Што трэба мне, бадзячаму?
Душа ня звыкла чуліцца.
Жыцьцё маё адзначана,
Як пройдзеная вуліца...

Неразуменьне зьяў, някрытычны падыход, павярхоўнае успрыняцьце навакольных зьяў даводзіць Дарожнага да частых зрываў (у поўным сэнсе гэтага слова).

Нашу сучаснасьць, вялікія дні будоўлі сацыялістычнага бяскласавага грамадзтва аўтар называе дальнымі днямі» г. зн. дні да якіх патрэбна яшчэ доўга ісьці.

У вершы **«Пагранічнік»** даецца малюнак аховы нашых савецкіх межаў чырвонымі пагранічнікамі.

Дзесьці там за асьнежаным полем
Вёскі родныя паляць агні...
І пяюць штосьць сасонкі такое
Пра вялікія дальнія дні.
Там будуюць вялікае нешта,
Кожны дзень сьцеле новы абрус...

Што гэта за «дзесьці», «штосьць», «дальнія», «нешта»? Чаму не паказаць сапраўднасьць, так як яна ёсьць, навошта такія загадкі? А мабыць сам аўтар не разумее, што мы будуем, як будуем, і абмяжоўваецца такімі выразамі, якія акрамя шкоды ніякай карысьці для чытача не прынясуць.

І гэта ня толькі ў вершы «Пагранічнік».

НЕДЗЕ пяюць муляры
Звоніць цэгла,
НЕДЗЕ гудуць правады ў палёх,
Трактары, МАБЫЦЬ
На поле заехалі,
Начыста ВЫТАПТАЦЬ чорны
быльнёг...

У вершы «на Ударных франтох» чытаем:

«Працуе краіна, гудуць правады,
На фронце ўдарным атакі!
БАБРУЙШЧЫНА Б'ЕЦЦА,
ЗА ТВОРЧЫ УЗДЫМ,
БАРЫСАЎ—ЗА ДОБРУЮ
ЯКАСЬЦЬ!»

Нельга так разьмяжоўваць барацьбу заводаў і фабрык аднаго гораду ад другога. Як Бабруйск, гэтак і Ба-

рысаў змагаюцца і за творчы ўздым і за добрую якасьць. Акрамя таго,—хіба барацьба за якасьць—гэта ня творчы ўздым? Тут усё паміж сабою арганічна цесна зьвязана, а з вышэйпрыведзеных радкоў выходзіць, што ў Бабруйску закінута барацьба за якасьць і гоняцца выключна за колькасьцю, а ў Барысаве наадварот.

Кожную перамогу на фронце нашага будаўніцтва аўтар успрымае, як нейкую нечаканасьць, раптоўнасьць, што «з неба звалілася».

Цэмантам пахне ў тумане,
І вапнаю...
Звоняць трамваі...
НЯЎЖО ГЭТА МЕНСК?

У зборнік невядома якім чынам трапіў, яўна шкодны верш «Ліст з **Палесься».**

З напісанага выходзіць, што Палесьсе—даўнейшае, пакутнае, жабрачае, (верш пісаны ў 1929 годзе).

І ўсё ізноўку, ЯК РАНЕЙ:
У полі грэчак, бель густая.
СТАРАЯ МАЦІ СЬНІЦЦА МНЕ,
З ПАГОРБЛЕНЫМ І СУМНЫМ
СТАНАМ...

Або яшчэ:

На лаве маці за сталом,
ЖУЕ СУХІ КАВАЛАК ХЛЕБА.

Маці сумуе, таму што;

Няма ніводнага з сыноў,
ЯНЫ ЎСЕ ШУКАЮЦЬ ДОЛІ...
І восень ходзіць за сьцяной,
Лісты губляючы па полі...

За сядзібай, якая належыць матцы Дарожнага:

АСЕНЬНІЯ палі,
І наш палетак ВУЗКІ, ВУЗКІ..:
ЯГО НАШ СМУТАК АПАЛІЎ,
На ім асеньнія атрускі:

Чытае Дарожны лісты з Палесься, успамінае гады дзіцячыя, і гаворыць у роспачы:

Жывыя вобразы мае,
Былыя радасьці і сьлёзы!
ХТО ВАС У ПЕСЬНЯХ АПЯЕ
НА ЛІРЫ СУМНАЙ ПРЫ ДАРОЗЕ?!»:

Ня лепшы малюнак «новага» Палесься мы бачым і ў другім вершы паэта «Да дому»:

::: «Да сяла ўжо недалёка,
Лёгкі дым ляціць з садоў,
МЛЫН СТАРЫ ЎСЁ ТАК-ЖА
БОКАМ,
ПАХІЛІЎСЯ НАД ВАДОЙ:
Дзеравяная званіца,
Ды разьбітыя званы,
(ім пара ўжо разваліцца)
СТОГНУЦЬ НУДНА Ў ЦІШЫНІ»:

І аўтару гэта—найлепшы прытулак, яго «каханая» радзіма:

«Вось ён, добры, МОЙ ПРЫТУЛАК»!
Колькі год і колькі зім...
Добры дзень, мая матуля!
Гэта я... Сяргей, твой сын.»

Дык вось якая песьня пра сёньняшняе Палесьсе! Ад гэтых радкоў павявае «старынай». Палесьсе па-Дарожнаму, ўсё яшчэ край бедны, зьбіты, што ніякіх зьмен туды рэвалюцыя ня прынесла: як стаяў пахілы млын, так і стаіць, і нават «званы стогнуць нудна ў цішыні».

Нельга не адзначыць таго, што ва ўсім зборніку вы ня знойдзеце амаль **ніводнага слова пра рэканструкцыю, пра будаўніцтва сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, арганізацыю калгасаў, будаўніцтва саўгасаў і МТС.** Ніводнага слова няма і пра **абвастрэньне клясавай барацьбы ў вёсцы і ў горадзе.** Усё па Дарожнаму, будуецца спакойна, бесьперашкодна, без усякіх супярэчнасьцяў. А гэта ўжо ёсьць, ня што іншае, як **адмаўленьне клясавай барацьбы, затушоўваньне сапраўднасьці, небальшавіцкі падыход да справы.** Ніводзін верш Сяргея Дарожнага пра «новыя дні» **не мабілізуе** працоўныя масы да барацьбы з клясавымі ворагамі. Гэта яшчэ раз гаворыць за тое, што паэта не разумее сучаснасьці, не зьяўляецца непасрэдным **удзельнікам** сацыялістычнага будаўніцтва і разгорнутай барацьбы з клясавым ворагам, а **пасыўны наглядальнік з** «жураўлінага лёту» за часткай працэсаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Мэханічны падыход да справы, прасталінейная фіксацыя зьяў, вузкі сьветапогляд—характарызуюць творчасьць паэта. Дарожны **пасыўна ўспрымае новыя задачы, якія стаяць** перад нашай савецкай літаратурай і надзвычайна **марудна** перабудоўваецца.

Наша задача, задача савецкіх пісьменьнікаў дапамагчы Дарожнаму хутчэй перабудавацца, своечасова паказваць на памылкі ягонай творчасьці з тым, каб паэта змог у хуткім часе аўладаць **дыялектычна-матарыялістычным творчым мэтадам,** даць сапраўды **паўнакроўныя мастацкія творы вартыя нашай эпохі.**

+) ДзВБ, 1932 г.

Я. Шапавалаў

Вершы Александровіча на расійскай мове

(„Стихи“ ГИХЛ 1932 г.)

Зьяўленьне зборніка вершаў Андрэя Александровіча на расійскай мове трэба вітаць, як буйны крок у справе азнаямленьня шырокіх працоўных мас расійскіх чытачоў з дасягненьнямі беларускае пралетарскае літаратуры, у справе замацаваньня інтэрнацыянальнай сувязі нацыянальных культур. У гэтым пляне неабходна заўважыць, што зборнік Александровіча зьявіўся з вялікім спазьненьнем. Але гэтае спазьненьне можна было-б яшчэ падараваць, калі-б сам зборнік, вершы з яго, маглі правільна і хоць-бы коратка, але поўна характарызаваць Александровіча, як беларускага пралетарскага паэта.

Падбор вершаў, дадзены ў зборніку, нас якія ведаюць творчасьць паэта ў арыгінале, якія ведаюць яго разьвіцьцё, прымушае пацісьнуць плячыма ад нечаканасьці.

Справа ў тым, што сярод агульнага ліку вершаў (а ўсіх вершаў 21) 15 вершаў адносяцца да пэрыяду 1925-29 гг. (прычым абсалютная большасьць іх да 1925-26 гг.) і толькі астатнія 6 вершаў адносяцца да 1930 г.

Творчасьць паэта за 1931-32 гг. абсалютна не дадзена, а між іншым, менавіта, у гэтыя гады характэрна ў творчасьці Андрэя Александровіча найбольш выразная клясавая мэтанакіраванасьць і адыход ад таго выпадковага, нацыяналістычнага, што яшчэ мелася ў больш ранні пэрыяд творчасьці паэта.

У такіх вершах як «Вартаўнік», «Газэтчык», і інш. ёсьць элемэнты пасыўнай сузіральнасьці і вольнага, ці неўсьвядомленага любаваньня працаю саматужніка як у вершах «За іголкай» і часткова «Шавец».

Такі падбор вершаў у першым перакладным зборніку, па нашай думцы, у лепшым выпадку неабдуманы крок. Для шырокіх працоўных мас расійскага чытача, трэба было для першачатковага знаёмства з паэтам даць найбольш сьпелыя творы, а ня творы якія бязумоўна значныя для разьвіцьця паэта але якія не даюць выразнага ўяўленьня пра творчы твар паэта.

Гэты недахоп зборніка значна павялічваецца ў большасьці вельмі няўдалым, а часамі і нікуды ня вартым перакладам.

Такія сакавітыя гучныя вершы, як «Сасна», «Мяцеліца» настолькі пакалечаны перакладчыкамі (Сьвятловым—першы верш і Галодным—другі), што ведаючы арыгіналы, проста няпрыемна чытаць. Судзеце самі:

...Эх сосенка-сосне,
дни суровые.
От бревна до бревна (?)
хата новая.
И болотная топь
будто в зори нам (!?)
Буйным цветом, красотой
разузорена.
Время скинуть гнет былой
уж пришло нам.
Замуруем ширь болот
мы бетоном...

Што гэта такое? Як прачытаць гэты пераклад без камэнтарыя перакладчыка?

З «Мяцеліцай» ня лепш ды і ўсе іншыя пераклады прымушаюць жадаць шмат лепшага.

Найбольш удалыя, у параўнаньні з іншымі, пераклады Антакольскага.

Трэба пажадаць каб ГІХЛ у далейшым выдаючы творы Александровіча, паклапаціўся пра тое, каб даць магчымасьць расійскаму працоўнаму чытату азнаёміцца з творчасьцю паэта не па тэндэнцыйна падабраных вершах, а больш усебакова і поўна і падругое, забясьпечыў добры пераклад, які не калечыць сэнсу.

У бібкалектары

У маі і чэрвені г. г. сэкцыяй літаратуры інстытуту ЛІМ БАН у бібкалектары былі наладжаны даклады на наступныя тэмы:

1. Агляд заходня-эўрапэйскай рэвалюцыйна - пралетарскай літаратуры—дакладчыца т. Гальперына.

2. Асноўныя этапы ў разьвіцьці сучаснай беларускай літаратуры—дакладчык праф. Піотуховіч.

3. Тэма калгаснага будаўніцтва ў асьвятленьні кнігі Лур'е «Стэп заве»—дакладчык т. Браншэйн.

4. Барацьба стыляў і жанроў, як выражэньне клясавай барацьбы ў літаратуры—дакл. праф. Барычэўскі.

Усе гэтыя даклады мелі за мэтавую ўстаноўку дапамагчы бібліятэкарам у набыцьці ведаў, неабходных у іх непасрэднай працы з кнігай. Дакладчыкі ўвязалі даклады з практыкай бібработы, змаглі падаць іх у простай і зразумелай форме, што са здавальненьнем адзначаюць бібліятэкі.

Ініцыятыву сэкцыі інстытуту трэба вітаць, як работу, праведзеную ў напрамку сувязі сваёй працы з канкрэтнымі задачамі культурнага будаўніцтва.

НАША ДЭКАДА

Над чым працуюць пісьменьнікі

Васіль Каваль — падрыхтаваў да друку аповесьць — «Права на мужнасьць» (праблема камандзіра Чырвонае арміі). Піша раман—«Дзень палымнее». Асноўная тэма—«Казарма-школа камунізму» і інтэрнацыянальная сутнасьць Чырвонай арміі.

Пятрусь Броўка—знаходзіцца ў лягерах Чырвонай арміі ў парадку творчай мабілізацыі. Мяркуе напісаць некалькі нарысаў пра жыцьцё чырвонаармейцаў у часе летняе вучобы. Працуе над аповесьцю «Дужасьць» з жыцьця камсамолу, якую разьлічвае скончыць да XV гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі. Напісаў нізку інтэрнацыянальных вершаў, з якіх думае скласьці невялічкі зборнік.

Цім. Зарэчны—Працуе над раманам з эпохі рэвалюцыі 1905 г. на вёсцы і над кніжкай навэль «Нянавісьць». Здадзены ў друк зборнік апавяданьняў і нарысаў «Пажары» і аповесьць «Зямля ў вятрох».

Брыгада ЦК КП(б)Б на кіно-фабрыцы «Савецкая Беларусь»

З 1-га па 20-е чэрвеня г. г. у Ленінградзе працавала брыгада па агляду кіно-фабрыкі «Савецкая Беларусь», у складзе наступных т:т. Вольскага, Гурчэнка, Мдэля, Рафальскага і Шамшура. Брыгада правяла на фабрыцы некалькі сходаў і творчых нарад па пытаньнях мастацкай якасьці творчай прадукцыі.

10 чэрвеня адбылася ўрачыстая сустрэча працаўнікоў кіно-фабрыкі з Яўрэйскім Дзяржаўным Тэатрам БССР і творчымі працаўнікамі Саюзкіно. На сустрэчы прысутнічалі рэжысэры Саюзкіно: тт. Фрыдрых Эрмлер, Юткевіч, Козенцаў, Траўбэрг і інш.

15 чэрвеня адбылася сустрэча тав. Вольскага з працаўнікамі Дзяржакадэміі мастацтвазнаўства. На пасяджаньні кіносэкцыі акадэміі мастацтвазнаўства, пры ўдзеле тав. Вольскага, прынята пастанова выдаць сумесную манаграфію пра Беларускую кінематаграфію (Інстытутам Літаратуразнаўства і Інстытутам Літаратуры і Мастацтва БАН—на беларускай мове, акадэміі Мастацтвазнаўства—на расійскай мове).

Ал. Кучар

Шляхі вялікае перабудовы

Аповесьць «Лявон Бушмар» мела пэўнае дадатнае значэньне для творчае перабудовы Кузьмы Чорнага. Гэтая аповесьць паказала, што ні ўтрыраваны псыхолёгізм, ні голы біялёгізм ня могуць прывесьці пісьменьніка да правільных творчых пазыцый. Чорны зразумеў, што адзіны шлях перабудовы свае творчасьці, вырашэньне глыбокіх сацыяльных праблем нашага часу.

Цяжкасьці ў перабудове сьветапогляду Кузьмы Чорнага былі выключна вялікія. Перабудова павінна была пайсьці па ўсіх асноўных ідэёвых стрыжнях творчых пазыцый пісьменьніка. Раман «Ідзі. Ідзі», які надрукованы ў часопісе «Узвышша» быў першаю грунтоўнаю спробаю выступіць супроць сваіх мінулых творчых пазыцый. У процілегласьць асноўным рысам свайго мінулага творчага мэтаду, дзе людзей яднала біялёгічная крэўнасьць, крэўнасьць псыхалёгічная, нацыянальная еднасьць. Кузьма Чорны імкнецца тут падкрэсьліць, што клясавая сутнасьць ляжыць у аснове паводзін чалавека, і што гэтая клясавая сутнасьць можа, і раскрыжоўвае шляхі самых блізкіх у біялёгічным сэнсе людзей. Вялікае раскрыжаваньне на клясавай аснове адбываецца вельмі шпаркаю хадою з пачаткам рэканструкцыі народнае гаспадаркі ў краіне. Гэтае раскрыжаваньне ў рамане адбываецца вакол сымбалю старога, няўрэзанае яшчэ дзічкі, на неўзаранай зямлі. Раскрыжаваньне шляхоў кулака Сегенецкага і можна сказаць, парабка Якуба Сегеня: адзін гібее ў беднасьці, у голадзе—другі заможны шляхціч, які эксплёатуе дачку Якуба Сегеня, сваю пляменьніцу: «От тут гэта. Ах! што ёсьць на сьвеце... От гэта самае месца! А Якуб Сегель моцны чалавек! Колькі ён на сваіх плячох вынес за свой век... Браты! Усё адно як дарогі раскрыжаваліся і ідуць, ідуць у розныя бакі».

Так раскрыжоўваюцца шляхі двух братоў і іх тут у паказе Кузьмы Чорнага яднае не фізіалёгічная крэўнасьць, а клясавасьць ёсьць стымул раскрыжаваньня іх шляхоў, іх нянавісьці.

Раскрыжаваньне шляхоў на клясавай глебе Чорны паказвае на прыкладзе людзей надзвычайна нават блізкіх у мінулым па змаганьні. Гэта Гарус і Галена ў разуменьні нацыянальнага пытаньня. Гарус, чалавек, які змагаўся разам з Галенаю ў Заходняй Беларусі, сядзеў нават у турме, але ў аснове яго змаганьня былі буржуазна-нацыяналістычныя ідэі. І яго шлях з шляхам Галены, з якою ён перажыў разам дні пакуты, голаду,—раскрыжаваліся. Ён здрадзіў інтарэсам рабочае клясы, стаў дапаможнікам кулацкае дзейнасьці, нацыяналістычным агентам. Чорны разьбівае ідэі адзінае нацыянальнае еднасьці людзей.

Ідэі раскрыжаваньня праводзяцца на ўсіх асноўных вобразах раману—на надзвычайна цікавым вобразе кулака Нахлябіча і яго сына. Ім, кулаком, супрацьстаўляецца шлях клясавага самаўсьведамленьня беднякоў Андрэя і Зыдара Пніцкага. Шляхі кулакоў і Пніцкіх таксама раскрыжоўваюцца. Раскрыжоўваюцца пэўным чынам і шляхі Зыдара і Андрэя Пніцкага, адзін з іх працуе на будаўніцтве гіганта, другі на сельскай гаспадарцы. Рост клясавае сьвядомасьці Зыдара ідзе хутчэйшым чынам ніж Андрэя.

Раскрыжаваньне шляхоў усіх гэтых людзей адбываецца на фоне сьмерці старога, і будаўніцтва прамысловага гіганта, калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Раман «Ідзі.. Ідзі» такім чынам нанёс першы сур'ёзны ўдар па мінулых асновах творчасьці Кузьмы Чорнага, ён у аснове чалавечых інтарэсаў паставіў клясавасьць. Гэта першае сур'ёзнае змаганьне Кузьмы Чорнага з самім сабою за клясавасьць пры паказе чалавечых дачыненьняў. Фізіалёгічныя дачыненьні, дружба, варожасьць, зайздрасьць, любоў, нянавісьць—падпарадкаваны клясавай ісцінасьці чалавека.

Больш таго, можна сказаць, што ў некаторых момантах Чорны перагінае нават у другі бок. Ёсьць у яго ў гэтым рамане тэндэнцыі зусім закрэсьліць біялёгічную крэўнасьць людзей, што зьяўляецца няправільным.

Раман «Раскрыжаваньне» мае на сябе адлюстраваньне характэрнае для пэрыяду перабудовы ў творчасьці Кузьмы Чорнага няўпэўненасьць, мае агульную ідэёвую раскіданасьць. Кузьма Чорны ўзяў у гэтым рамане цэлы шэраг, як мы бачылі, праблем і ніводнай стала і поўна не разьвязаў. Ёсьць тут у рамане тэндэнцыі паказу—аголеных ідэёвых схем, так што ідэі раману не знайшлі сабе поўнага пераламленьня праз пачуцьцёвую і вобразную форму. Раман вельмі-ж раздроблены і шмат, вельмі шмат губляе ад кампазыцыйнае і сюжэтнае заблытанасьці. Гэтая кампазыцыя і сюжэтная складанасьць была таксама своеасаблівым выхадам пісьменьніка з кампазыцыйнае і сюжэтнае павольнасьці разьвіцьця дзей у мінулай творчасьці—у дынамічнасьць, у работу над паказам шматграннага і шматвобразнага руху падзей, але выхадам няўдалым і пабудаваным на памылковых асновах.

«Работа перамолвае людзей, у які бок ідзе работа, у той бок хіліцца чалавек. Нашы людзі ня лішне маглі да гэтуль хіліць сваю работу ў той бок, у які самі захочуць. Гэтак жылі ўсе. А хто спрабаваў, таго або ламала, або адкідала назад.

Аповесьць «Вясна» і паказвае, як працэс калектывізацыі вёскі зьмяняе псыхіку, увесь пабытовы ўклад сялянскага жыцьця, як работа перамолвае людзей, як нараджаюцца новыя чалавечыя пачуцьці, новыя людзкія дачыненьні.

Аповесьць «Вясна» была другім значным і ўпэўненым крокам у творчай перабудове Кузьмы Чорнага. Тое, што яскрава вызначаецца ўжо ў «Раскрыжаваньні», тут знайшло далейшае разьвіцьцё. Змаганьне за клясавасьць пры паказе людзкіх адносін атрымлівае ў аповесьці найбольш яскравае выражэньне. Канец бязвольнаму, пасыўнаму, пакорнаму, прыгнечанаму чалавеку. Гэты чалавек не ахоплены жахам, роспачу перад будучыняю. Канец «думающему» чалавеку, пачатак чалавека «созидающего». Гэты чалавек цьвёрда ведае свае мэты. Гэты чалавек ведае, хто яго клясавы вораг і хто яго прыяцель. Ён, гэты чалавек, не стаіць на варце прытупленьня клясавага антаганізму і прапаведзі клясавага спакою, чалавек знаходзіць сам сябе, выяўляе найбольш поўна сябе, выходзіць з гібеньня на вялікі шлях будаўніцтва, толькі ў змаганьні са сваімі ворагамі.

Бядняк Ладымер ня лічыць кулака Банадыся сваім клясавым братам, так як гэта Мацей у «Зямлі» лічыць Савастыяна. Ладымер на словы Банадыся, што ўсё трэба спродваць бо варочаецца паншчына—арганізуюцца калгасы—адказвае:

— «Ну добра,—пашоў у Ладымера перапалох з другога боку,—у цябе чатыры каровы, дык калі ты адну й прадасі, дык ліха цябе ня возьме. А я калі апошнюю прадам?»

Кулацтва ў аповесьці паказана азьвярэлым, якое эксплёатуе і зьдзекуецца над парабкамі. Парабкам у немагчымых умовах эксплёатацыі выгадаваўся Костусь—арганізатар калгасу. Ён сам ірваў каменьні на кулацкім полі, яго матка памерла ад цяжкое работы парабчанкаю кулака, таксама як ня выходзячы з парабкоўства,—памёр і бацька. Парабкоўства Костуся, сьмерць яго маткі паказана К. Чорным з надзвычайнаю псыхалёгічнаю глыбінёю. Але гэта не псыхалёгічнасьць, якую мы бачылі ў зямлі—пры паказе сьмерці Тамаша, дзе пачуцьці людзей зьнітоўваюцца, дзе ўсе людзі і багатыя і бедныя адчуваюць сябе біялёгічна роўнымі перад сьмерцю. Кузьма Чорны тут, якраз падкрэсьлівае, што прычынаю сьмерці маткі Костуся, зьяўляецца кулацкая эксплёатацыя.

Псыхалёгічна надзвычайна поўна перададзены адчуваньні Костуся ў дзень сьмерці маткі. Але гэта псыхалёгія клясавая, гэта адчуваньне крыўды, болю, жалю,—за сваё згубленае ў цяжкай працы маленства, пакутніцкія адчуваньні эксплёатуемага, жалю па матцы і нянавісьці да хутараніна, які зьдзекуецца:

«Маці мая папраўляла ў галавах нябожчыцы сьвечку, моцна, з вялікаю шчырасьцю, заплакала, стала на калені і доўга малілася. На двары вусаты дзядзька—хутарскі гаспадар ладзіў воз, каб весьці нябожчыцу. Вусатаму дзядзьку памагаў ён—мой аднагодак, парабчук, сірата... Я з ганку глядзеў на яго. Ён быў маўклівы, вельмі рухавы. Між работаю ён падбег да мяне:—можа ў цябе ёсьць закурыць? Дай душу праклятую хоць.—Гэта была роспачная сталасьць і цьвёрдасьць —я цябе пакуру!—з халодным спакоем устрапянуўся гаспадар—я цябе зараз так пакуру, што ты мяне доўга памятацімеш як курыць. Увык! Тады хлапчына адвярнуўся і сьціснуў зубы, я ўбачыў, што ён плача. Мне стала ясна: няхай-бы гаспадар, хоць у гэткі момант сказаў інакш: «Ня ўвыкай сынку, курыць з малых год. Мяне як агнём паліла страшнае пачуцьцё, якому я назвы не знаходжу цяпер».

Невялічкая, але якая з выключнаю сілаю перадае лепшыя і глыбейшыя з чалавечых пачуцьцяў рыса,—на клясавай аснове набывае, магутны сэнс і выклікае агнём і полымем узрошчанае замілаваньне да папрыгнечаных, эксплёатуемых. Костусь пасьля вырас у камуніста, добрага арганізатара калгасу. Мы маем у «Вясне» паказ, як фармуюцца новыя калектывістычныя дачыненьні, новыя дачыненьні да работы. Міхалючок, сын партызана, які загінуў на грамадзянскай вайне зьяўляецца сымбалем новага чалавека у калгасе. Яго шануюць і любяць усе калгасьнікі як сваё дзіця. Вакол яго зьнітоўваюцца ўсе лепшыя пачуцьці калгасаўцаў.

Рэзка клясавы падыход да рэчаіснасьці зрабілі пераварот ва ўсім творчым абліччы Кузьмы Чорнага.

Але прызнаючы за асноўнае ў «Вясьне» клясавасьць пры падыходзе да рэчаіснасьці, трэба адзначыць тыя вялікія зрывы, якія вынікаюць у Кузьмы Чорнага з недастатковасьці сьветапогляду. Сам аўтар прызнае вузасьць аповесьці ў тым, што яна калектыўную апрацоўку зямлі не бярэ ў сувязі з усімі зьменамі навакольнае рэчаіснасьці, бо калектывізацыя, як ён кажа,—гэта ня толькі калектыўная апрацоўка зямлі.

Але справа, зразумела, ня толькі ў гэтым. Нават працэс калектывізацыі, працэс калектыўнае апрацоўкі зямлі Кузьма Чорны ня змог поўна і ўсебакова паказаць. Тут абмінуты, бадай, усе цяжкасьці гэтага працэсу, тыя цяжкасьці, якія шкодзілі справе ўнутры самога калгасу, тыя клясава-варожыя сілы, якія пробуюць падарваць калгас з нутры. Калгас у паказе Чорнага абсалютна ізаляваны ад партыйнае арганізацыі. Камуніст Костусь няправільна і аднабакова вядзе змаганьне з «ляўацкімі» загінамі ў справе калгаснага будаўніцтва.

У «Вясьне», гэтак як і ў рамане «Раскрыжаваньне» ідэйная схэма недастаткова выражана праз усебаковы мастацкі вобраз. Другая асноўная і вельмі важная памылка аповесьці ў тым, што яна ў поўнай адпаведнасьці з творчымі ўстаноўкамі Кузьмы Чорнага на мінулых этапах яго творчасьці, пабытовыя ўзаемаадносіны ў сям'і Рыгора, распад гэтае сям'і, пабытовыя дачыненьні калгасаўцаў ізалюе, ці правільней разьвівае толькі на фоне калгасу, а ня ў сувязі з усёю сацыяльнаю практыкаю гэтых людзей. Пабытовыя дачыненьні выглядаюць непатрэбным прыдаткам, які перагружае аповесьць, не садзейнічае строгай ідэёвай арганізацыі эмпірычнага матар'ялу аповесьці, вакол аднае асноўнае арганізацыі ідэі.

Падкрэсьліваньне клясавасьці ў чалавечых дачыненьнях ёсьць адзін з самых важных і асноўных элемэнтаў у творчай перабудове Кузьмы Чорнага. Клясавасьць у паказе чалавечых дачыненьняў пранізвае ўвесь апошні раман Кузьмы Чорнага «Бацькаўшчына».

З разуменьнем «бацькаўшчына» стаіць цэлы шэраг адказнейшых і глыбокіх пытаньняў: адносіны нацыянальнага да клясавага, адносіны пралетарыяту капіталістычных краін да «свае» краіны, да свае ўяўнае бацькаўшчыны, адносіны пралетарыяту капіталістычных краін да СССР і іншыя і інш. Вялікая адказнасьць ляжыць на нашых работніках літаратурнага фронту, якія бяруцца да асноўнае праблемы «бацькаўшчыны». Раман Кузьмы Чорнага «Бацькаўшчына» мае асноўнаю ідэяю сваёю—давесьці, што ў капіталістычных умовах пралетарыят ня мае за бацькаўшчыну «сваю» капіталістычную краіну і толькі пры ўсталяваньні дыктатуры пралетарыяту ў СССР сусьветны пралетарыят здабыў сабе бацькаўшчыну, якую ён сваёю крывёю будзе абараняць ад нападу ворагаў. У першую чаргу раман «Бацькаўшчына» накіраваны як супроць усяе нацыянал-дэмакратычнае самабытніцкае абмежаванасьці, так і супроць элемэнтаў буржуазна-нацыяналістычнае замкнёнасьці ў межы «свайго краю», супроць культываваньня нейкае асаблівае сьвядомасьці і пачуцьцяў, якія ўласьцівы нібыта толькі «беларускаму народу», і якое мы мелі на першым этапе творчасьці Чорнага. Тым самым раман «Бацькаўшчына» падрыва мінулыя творчыя асновы пісьменьніка, па-другое, раман проста накіраваны супроць Кнута Гамсуна і яго раману «Валацугі», які, раман, мае двусэнсоўны рэакцыйны характар. У рамане «Валацугі» Кнут Гамсун разгортваючы жыцьцё двух матросаў даводзіць, што вандроўнае жыцьцё, адарванасьць ад свае бацькаўшчыны ёсьць разбэшчваньне лепшых чалавечых пачуцьцяў, што гэтая адарванасьць ад свае бацькаўшчыны ў капіталістычных умовах ёсьць спустошваньне свайго жыцьця, ёсьць згуба для чалавецтва.

У процілежнасьць асноўнай ідэі раману Кнута Гамсуна Кузьма Чорны ў сваім рамане даводзіць, што пры капіталістычных умовах буржуазная дзяржава ня можа стаць бацькаўшчынай ні воднага сумленага пралетарыя, што гэтая «бацькаўшчына» голаду, галечы, беспрацоўя, шыбеніц будзе заўсёды праклінацца і ганьбіцца ў сьвядомасьці рабочае клясы.

Леапольд Гушка ў рамане шукае сабе бацькаўшчыны ў Нямеччыне, у Сілезіі. Але адтуль ён як і яго продкі былі выгнаны за ўдзел у рэвалюцыйным русе. І Леапольд Гушка на заўсёды ў пачуцьцях сваіх пракляў Сілезію—сваю «бацькаўшчыну» голаду, жабрацтва. Гушка апынуўся ў царскай Расіі. Батрацтва — служба ў панскім маёнтку, нарэшце ён выгнаны з маёнтку, з жонкаю і малымі дзецьмі павінен ісьці сабе шукаць новую бацькаўшчыну. Тут пачынаюць Гушку захапляць ідэі ўласнасьці—ён імкнецца здабыць сабе свой кавалак зямлі думаючы, што ў гэтым адзінае выйсьце і што тут ён сапраўды забудзе сваю бацькаўшчыну. Заслуга Кузьмы Чорнага ў тым, што ён канчаткова разьбівае мары Леапольда Гушкі ў яго імкненьні да ўласнасьці. Ён надзвычайна глыбока і пераканаўча паказвае, што як Леапольд Гушка не працуе, як ён не гаруе над камяністаю неўрадлівай глебаю, мары яго на ўласнасьць разьбіваюцца, рушацца. Леапольд Гушка, як і яго сын Адась адчулі гэтую новую праклятую «бацькаўшчыну» — Расійскай імпэрыі, калі пачалася імпэрыялістычная вайна, ім даюць падданства і яны павінны ісьці абараняць Расію гэтую «турму народаў», «самую горшую з царскіх імпэрый».

Іншакшым шляхам здабывае сваю бацькаўшчыну сын Леапольда Гушкі Адась Гушка. Яго шлях—гэта шлях рэвалюцыянэра, шлях бальшавіка. Чалавек, які ўцёк з маёнтку пана, які ў першыню адчуў у сабе вялізарную сілу і ўпэўненасьць, калі на фоне

(Працяг на 4 стар.).

Янка Палескі, Паўла Гайшун, Янка Хмель.

Халтурнае слова аб юнай краіне

Віктар Казлоўскі „Слова аб юнай краіне“. ДзВБ.—1932 г., стар. 98, цана 1 р. 40.

Чырвоная халтура ў нашай беларускай савецкай літаратуры, на жаль, знаходзіць сабе яшчэ значнае месца. Яе галоўным чынам даюць маладыя кадры паэтаў і пісьменьнікаў, якія ў сваёй большасьці **не аўладалі сьветапоглядам дыялектычнага матэрыялізму**,—адсюль і прадукцыя, якая выходзіць з пад пяра гэтых паэтаў ня больш ня менш, як чырвоная халтура, агульнасьць і нават бязсэнсоўнасьць, што зьяўляецца ў скарбніцы нашай беларускай савецкай літаратуры проста бракам. На жаль гэты «брак» па віне рэдактароў у вялікай колькасьці выдаецца Выдавецтвам, шмат дарэмна траціцца паперы і работы.

Мы маем на ўвазе ў дадзеным выпадку кніжку вершаў **Віктара Казлоўскага «Слова аб юнай краіне»**, выданую ў 1932 г. Гэтая кніжка мае ў сабе 18 вершаў, напісаных аўтарам пераважна на працягу 1929—30 г. г.

Аўтар ў сваіх вершах імкнецца зрабіць паказ старога капіталістычнага ладу і супроцьлежна гэтаму паказаць будаўніцтва новага сацыялістычнага ладу. Аднак, аўтар ня здолеў паказаць, стары капіталістычны лад ва ўсіх яго супярэчнасьцях, а толькі па вярхоўна коўзаецца ў справе паказу гэтага ладу. Зусім адсутнічае канкрэтны паказ барацьбы пралетарыяту і працоўнага сялянства супроць капіталістычнай эксплёатацыі, капіталістычнай сыстэмы.

Увесь паказ старога ладу аўтарам даецца выключна на грунце сваіх уласных успамінаў, праз «сьлёзы жабракоў», упадніцтва і роспач.

Чытаем:

Даволі ўжо
Ў жарбацтве зьневажалі,
Скрывавілі
І змучылі душу...
І што-ж далей?
... Пайду у прасьцяг
Сьняжынак скрыжаваных..:
Чаго?
Падсухаць дрэў
Нявысьмеяны шум.

І толькі. Вось, дзе выхад знойдзены. Ня трэба ўпартай барацьбы супроць прыгнёту і прыгнятальнікаў. Па Казлоўскаму выходзіць:—ідзі ў «прасьцяг сьняжынак скрыжаваных», слухай «дрэў нявысьмеяных шум» і ўсё будзе добра. Клясавую барацьбу аўтар абыходзіць і «ў сьняжынак скрыжаваных» шукае збавеньне.

Аўтар, мусіць, не разумее таго, што, каб зьнішчыць «жабрацтва» каб зьнішчыць капіталістычную сыстэму цалкам патрэбна, каб пралетарыят пры актыўным падтрыманьні працоўнага сялянства, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі зрабіў рэвалюцыю і ўзяўшы ўладу ў свае рукі пачаў будаўніцтва новай сацыялістычнай эканомікі.

У вершы «абвяшчаю я свой прыгавор» ёсьць наступныя радкі:

Брат на брата ішоў з нажом,
А паніч толькі піў ды жор...

у якіх аўтар імкнецца паказаць тое што імпэрыялістычная вайна — кана нясе надзвычайнае гора працоўным рысьць для буржуазіі, што гэта вайўсяго сьвету, адняак, з гэтага нічога ня выходзіць. Аўтар ня ўскрывае са праўдных прычын імпэрыялітсычнай вайны, як вайны захопніцкай, ён не паказвае адзінага выхаду з гэтай вайны шляхамператварэньня яе ў вайну грамадзянскую.

Аўтар прасякнуты клясавай нянавісьцю да гэтых «панічоў», рашуча заўляе:

Я цяпер на ўвесь сьвет крычу
Што адпомсьціць хачу панічу.

Мала крычаць! Патрэбна арганізаваная барацьба пралетарыяту і працоўных мас, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі супроць таго ладу, які параждае грабежніцкія войны. Гэта ня выклік да барацьбы, а роспач. Гэта крык дробна-буржуазнага «рэвалюцыянэра», які спалохаўшыся вайны ня ведае і не жадае адзінага рэвалюцыйнага выхаду з яе.

Буду я да апошніх сіл
Ваяваць за краіну красы.

Альбо:

Пакуль дзень мой яшчэ ня зьмерк
Я зары не аддам на зьдзек.

Поўная недарэчнасьць. Падумаеш, якой «сілай» валодае Казлоўскі, што нават **«зары не аддасьць на зьдзек»**. Трэба запамятаць, што толькі працоўныя Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пры актыўным падтрыманьні працоўных усяго сьвету змогуць адбіць напад імпэрыялістаў, абараніць краіну Днепрабудаў.

Такімі-ж павярхоўнымі рысамі, так сама агульна, з грубейшымі палітычнымі памылкамі, аўтар малюе і новае сацыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне.

Кожны наш крок—гэта скарб перамог,
Кожны наш рух—гэта творчыя рытмы.
Сьвет мы ўзялі ў капітальны ра монт—
Здолеем новую эру стварыць мы.

Сьвет мы ўзялі не ў рамонт, а зруйнаваўшы. капіталістычную сыстэму **«мы стварылі савецкі тып дзяржавы,** пачалі гэтым сусьветна гістарычную **эпоху, эпоху палітычнага панаваньня пралетарыяту, прышоўшую на зьмену эпохі панаваньня буржуазіі»** (Ленін), для таго, каб пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, ажыцьцяўляючы вучэньне Маркса—Леніна пабудаваць ў нашай краіне бясклясавае сацыялістычнае гармадства. А з вышэйпрыведзенага чатырохрадкоўя выходзіць, што мы рамантуем стары струхнелы капіталістычны сьвет.

Пад песьні траў—
Ды пад машыны грукат
другі сусьвет збудуем
Мы з руін.

Казлоўскаму пара ведаць пра тое, што мы «другі сусьвет» будуем і па будуем ня з руін, а на руінах.

Успамінаючы часы белапольскай акупацыі аўтар шмат гаворыць аб «крыўдзе», «зьдзеках», «растраляных днёх» і толькі некалькі радкоў прысьвячае сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў Савецкай Беларусі.

Як-жа Казлоўскі разумее гэтую рэканструкцыю, як ён «малюе» «новую калгасную вёску.

Вось мая вёска
Над ціхай ракой
У хвалях аўсоў патанула.
Кожны цяпер
Перастаўлен там кол,
Перакопана кожнае шула.
Сёньнека створан
калгас «Будаўнік»
Ператворана шчасьце
Напружанай працы»...

Хіба ў «перастаўленьні колаў» і «перакопцы шул» сутнасьць сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі? Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў разуменьні Казлоўскага не абумоўлена працэсам жорсткай клясавай барацьбы на вёсцы. Калгас, які аўтар піша ў толькі што прыведзенай прыпеўцы, не зьяўляецца прадуктам клясавай барацьбы і ўпартай напружанай работы.

Аўтар, пішучы, пра сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, ні слова ня кажа пра кіруючую ролю пралетарыяту ў гэтай рэканструкцыі.

Ва ўсім сваім зборніку аўтар ні слова ня кажа пра кіруючую ролю авангарда пралетарыяту—камуністычнай партыі, якая кіруючыся вывучэньем Маркса, Леніна арганізавала рабочую клясу і працоўныя масы на пераможную Кастрычніцкую рэвалюцыю, а пасьля—на пасьпяховае будаўніцтва сацыялізму.

Павярхоўнасьць, безканкрэтнасьць, часта аўтара даводзіць да бязглузьдзіцы, простага набору слоў.

Крок ды за крокам,
Крок ды за крокам
Ад раньня да змроку
Чуецца тачачны грук.
Цьвёрда ды горда,
Горда ды цьвёрда
На зло лютым лёрдам
Расьці ды з руін Беларусь.

Аўтар думае, што сацыялістычнае будаўніцтва разгортваецца з мэтай зрабіць «зло лёрдам». **Так сьцьвярджаць можа толькі палітычна няпісьменны чалавек.**

Казлоўскі моцна пакахаў «лозы ніцыя», «шэлест травы». Што яму да машын заводаў, фабрык, што яму да таго, што Савецкая Беларусь становіцца краінай індустрыяльна аграрнай.

Яго «душа»
Устрывожаная ірвецца
Да той зямлі.
Дзе мора ня чуваць,
Дзе кіпарыс
Ня гнецца над павецьцю,
Дзе толькі у лозах
Шалясьціць трава...

(«у крыме» ст. 87).

Палітычная няпісьменнасьць аўтара, адсутнасьць глыбокага падыходу да апрацоўкі сюжэту выглядае з кожнага вершу яго зборніка. Бяручы пад «абстрэл» «ныцікаў» (праваўхілістаў) Казлоўскі адзначае:

Іх (ныцікаў-аўтара) жыцьцё расьцьвіце
Ды зноў з роспачы ўніз
З кручаў стромкіх
Спадае у бяздоньне.

У якіх гэта выпадках і калі «расьцьвітае жыцьцё» апартуністаў ныцікаў, пасьля зноў «спадае у бяздоньне?» Толькі камуністычная партыя, загартаваная ў ня прымірымай барацьбе з апартунізмам ўсіх масьцей і колераў і ў першую чаргу з правым ухілам забясьцечыла нябачанныя ў гісторыі тэмпы росквіту сацыялізму ў СССР.

Гэтага, як відаць, Казлоўскі не разумее.

У вершы «Гаварылі соснам» Казлоўскі наводзіць паклёп на Чырвоную армію.

Праводзячы сына ў Чырвоную армію маці ўся ў сьлязах прычытвае:

«Ой нашто мой любы ты мяне пакінуў» і г. д.

і тут-жа ідзе адказ сына:

«Ня сумуй матуля, ня сумуй ня згіну
Сьцерагчы навучуся вольную краіну»...

У РСЧА бацькі праводзяць сваіх сыноў з радасьцю, а не з «сьлязьмі» і «сумай», бо яны ведаюць што Чырвоная армія-школа барацьбітоў за заваёвы Кастрычніцка, што яна рыхтуе лепшых змагароў за будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

Уласнае абывательскае «Я» аўтара стаіць вышэй ўсяго ў гэтым зборніку. У кожным вершы, у кожным радку Казлоўскі выступае са сваім «Я». Наадварот масы, рабочага калектыву у вершах няма. Ва ўсім зборніку налічваецца некількі с оцен «я» «Мой» «мая» і г. д.

Шмат яшчэ ёсьць прарываў і заган, пра якія мы ўжо гаварыць ня будзем. Трэба толькі адзначыць, што «найлепшую» прадукцыю халтуры, абывательскіх «яканьнеў» даў бязумоўна **В. Казлоўскі** ў сваім зборніку. «Слова аб юнай краіне».

Выдадзеная гэта, нікому не патрэбная халтура Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі ў 1932.

Радактар **А. Сянкевіч.**

Шляхі вялікае перабудовы

(Пачатак гл. на 3 стар.)

ночы, падобны на тысячы такіх-жа як ён рабочых,—ён стаяў нагамі ў анучах і з молатам ў руках, які прайшоў праз франты імпэрыялістычнае і грамадзянскае вайны праз турму. баі ў Кастрычніку. На гэты шлях, шлях рэвалюцыйнага змаганьня ў часе польскай акупацыі ідзе і Леапольд Гушка і сотні іншых сялян, якія ў рэвалюцыйным змаганьні здабываюць сабе сваю бацькаўшчыну і гэтую сваю бацькаўшчыну здабытую сваёю крывёю Леапольд Гушка як і Павел Няміра пры савецкай уладзе знайшлі ў калгасе, у актыўнай савецкай рабоце.

Вось асноўнае ў рамане «Бацькаўшчына».

Праблема, якую падымае на вырашэньне Кузьма Чорны вельмі вялікая, сур'ёзная, і глыбокая.

Як-жа вырашыў яе Кузьма Чорны. Творчы мэтад Кузьмы Чорнага ў гэтым армане супрацьлеглы мэтаду пасыўізму ў мінулай яго творчасьці. У Чорнага тут дзейнічае, жыве і змагаецца чалавек клясавы, яго мэты акрэсьленыя ніякія «агульначалавечыя» псыхалёгічныя пачуцьці, альбо біалёгічная крэўнасьць ня можа гэтаму чалавеку замяніць яго клясавых інтарэсаў. Кузьма Чорны ў рамане не ігнаруе і побытам, але гэта ёсьць не ўцяканьне ў вузка пабытовае жыцьцё, каб абмежаваць сябе ад паказу клясавых інтарэсаў чалавека, як гэта мы маем і ў«Зямлі» і ў «Лявоне Бушмары», а наадварот побыт, пабытовыя ўзаемадачыненьні асьвятляюцца, ставяцца ў залежнасьць да клясавых людзкіх адносін. У рамане Кузьма Чорны разгортвае глыбокі паказ псыхолёгіі людзей. Але гэта такі паказ дзе псыхалёгічныя адчуваньні, думкі і настроі залежаць ад яго клясавае практыкі, вынікаюць з яго клясавае практыкі.

У рамане «Бацькаўшчына» замест псыхалёгічных профіляў, замест псыхалёгічных схэм, мы маем не пасыўных, а дзейных клясавых людзей.

Паказ працэсу фармаваньня бальшавікоў у вобразе Адася Гушкі, Рыгора Чуйкі і інш. мае вялікае значэньне ня толькі для самага творчага росту Кузьмы Чорнага, але і для ўсяе нашае літаратуры.

Разглядаючы «Бацькаўшчыну» Кузьмы Чорнага мы кажам:—у вырашэньні асноўнае вялізарнейшае праблемы нашага часу, праблемы бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту—Кузьма Чорны стаіць на пазыцыях рэвалюцыйнага пралетарскага сьветапогляду. Па-другое, самы факт распрацоўкі такіх вялізарнейшых праблем нашага часу сьведчыць пра вялікі ідэёвы і мастацкі рост нашае літаратуры. У жанравым сэнсе рамкі аповесьці вызначаныя аўтарам—ідэёвай значнасьцю і глыбінёю распрацоўкі тэмы—разгортваюць аповесьць у раман.

Аднак, ці льга сьцьвярджаць, што «Бацькаўшчына» ёсьць поўнае аўладаньне пралетарскім сьветапоглядам? Так сьцьвярджаць, памылкова і шкодна. Гэтак сьцьвярджаць значыць забыцца на ўсю мінулую творчасьць Кузьмы Чорнага на ўвесь той цяжкі шлях які ён прайшоў.

Раман «Бацькаўшчына» мае першаю сваёю памылкаю тое, што рост вобразаў бальшавікоў Чорны паказвае як аднолькавых, не зьвязаных і ізаляваных ад усіх бальшавіцкіх арганізацый, ад усяго пралетарыяту. Такімі менавіта зьяўляецца і Адась і Рыгор Чуйка. Акрамя гэтага працэс росту бальшавікоў, як і ўся другая і трэцяя частка аповесьці мае ў сабе вельмі значныя элемэнты схэматычнага паказу, і недастатковай разгорнутасьці падзей, вобразаў і характару людзей, не паказана, як з Адася маянтковага парабка, чалавека псыхалёгічна замкнёнага ў сабе, які вельмі неакрэсьлена разумее рэвалюцыйныя задачы, нараджваецца рэвалюцыянэр, як ён перамог адмоўныя бакі свайго характару, бо напрыклад будучы парабком у маёнтку ён замест таго, каб весьці тут рэвалюцыйную работу, раптоўна няма ведама з якіх прычын выходзячы пакідае маёнтак і ідзе працаваць на шашу. А пасьля мы ўжо адразу сустракаем яго як закончанага рэвалюцыянэра. Як Рыгор Чуйка стаў падпольным бальшавіцкім работнікам, зусім не паказана. А галоўнае, абодва гэтыя бальшавікі не паказаны ў асяродзьдзі рабочае клясы, у іх рабоце. Тут, у гэтай адарванасьці рэвалюцыйных работнікаў ад пралетарыяту мы маем элемэнты спадчыны ад мінулай «ізоляцыі» людзей ад практыкі сацыялістычнага будаўніцтва ў творчасьці Кузьмы Чорнага. Але найбольш, спадчына пасыўізму, замкнёнага псыхалёгізму, праявілася ў Кузьмы Чорнага ў паказе старога Няміры. Гэты вобраз ёсьць просты працяг тых вобразаў бездапаможным пакутнікаў, якія былі на першым этапе творчасьці Чорнага, а між іншага ў мастацкім сэнсе гэта ў рамане найбольш закончаны вобраз. Стары Няміра пакутуе, але нясупраціўляецца, над ім зьдзекуюцца, а ён на ўсё адказвае ціхаю нейкаю жабрацкаю пакораю, ён інстынктыўна цягнецца да савецкага Саюзу (знаходзіцца ён у Польшчы) але яго туды цягне свой кавалак зямлі, уласнасьць, свая радня. Ён свайго не дасягнуў. Так ён і застаўся прагнаным ад усюль жабраком пад касьцёламі з выцягнутаю рукою і з запалам у вачох накіраваным на Ўсход, але бязьсільным што кольвек зрабіць.

Нарэшце, ідэалістычныя элемэнты творчага мэтаду ёсьць у армане і яны выражаны ў тым, што вельмі часта паказ рэчаіснасьці, працэсу, дзеі, рэчы, альбо стану рэчы робіцца ў Чорнага ці праз суб'ектыўнае імпрэсыяністычнае ўстрыйманьне самога аўтара або дзейнае асобы (так напрыклад, беднасьць Леапольда Гушкі, яго разбурэньне, паказана праз суб'ектыўнае ўспрыйманьне яго жанкі і інш.) а тэтым не заўсёды поўна перадаецца аб'ектыўны стан рэчаў па-за нашымі пачуцьцямі.

Зразумела, рэзка адмоўным трэба лічыць тое, што выхад Кузьмы Чорнага на вырашэньне такое важнае ідэёва праблемы меў значную даніну і схэматызму. Ад Кузьмы Чорнага мы маем права патрабаваць, больш чым ад каго другога, паказаў глыбокага, шматграннага і ўсебаковага.

А для кожнага хто знаёмы з раманам «Бацькаўшчына» зразумела, што ў другой і трэйцяй частцы пісьменьнік вельмі-ж ігнаруе гэтую шматграннасьць і шматбаковасьць паказу рэчаіснасьці.

Усё намі адзначанае не зьніжае таго значэньня якое мае раман «Бацькаўшчына» для творчага разьвіцьця як Кузьмы Чорнага, якое мае выхад Кузьмы Чорнага ў кола тэм, вобразаў і пачуцьцяў новага чалавека, у кола сусьветна-гістарычных праблем нашага часу, так і тое значэньне, якое мае раман для Беларускае Савецкае літаратуры. Гэта адзін з самых вялікіх твораў савецкае літаратуры БССР.

Кузьма Чорны стаіць на вялікіх шляхох.

Праз супярэчлівы і складаны шлях свайго разьвіцьця ён змог выйсьці ў новыя шляхі, шляхі вялікіх мастацкіх абагульненьняў, шляхі вялікіх перспэктыў. Ён прышоў да пралетарыяту і гэтым самым узбагаціў новымі вялікімі магчымасьцямі сваю творчасьць.

Ток Імчыцца

(О. Вэйлер „Ток мчится“, „Профиздат“, Москва 1932 г.)

Кніжка электрыка О. Вэйлера—«Мчится ток»—проста, шчыра і мастацка падае каталак з гісторыі Гомельскай электрастанцыі. Бадзёрыя ўдарнікі з жалезнай брыгады Харытона. Да віднэнка. Аўтары, Марка Ліпковіч, Царанкоў да апошняга адданыя справе будаўніцтва, былыя беспрытульнікі, перавыхаваныя заводам, некалькімі ўдалымі рысамі маладога, але здольнага пяра, назвычайна добра паказаны. Чытачу міжвольна хочацца перанесьціся на ўзбярэжжа Сожу, дзе высокія слупы перапляліся павуцінай праваdoў, дзе ў грохаце і шуме паважна выдзяляецца электрастанцыя. Барацьба за эканомію, за прамфінплян, за новае будаўніцтва, за сацыялістычныя мэтады ў працы паказаны месцамі сухавата, але ўсё-ж не схэматычна.

У Вэйлера мы не знаходзім хвалебных гімнаў машынам (на што хварэюць некаторыя маладыя рабочыя пісьменьнікі), а знаходзім тых, хто будуе гэтыя машыны, тых, хто дабіваецца іх удасканаленьня, для якіх завод зьяўляецца вялікай школай для перавыхаваньня, для загартаваньня сіл, накірованых для пабудовы сацыялізму.

Вэйлер паказвае сваіх герояў ня толькі ў цэсе, але і дома, ня толькі іх сёньняшняе, але і ўчарайшае. Гэта аналізаваць клясавую накіраванасьць дае магчымасьць больш шырока пра кожнага «героя», знайсьці тую крыніцу, адкуль выцякае бязьмерная адданасьць справе пабудовы сацыялізму, альбо зьвярыная варожасьць да ўсяго новага, дробна-ўласьніцкая адзічэласьць.

Рабочы Ахрэм Андрэевіч трывожыцца за эканомію кожнае заводзкае капейкі, ён нават тады, калі ўжо сьпяць жонка і дзеці, доўга сядзіць над часопісамі і падобна Архімэду ўскрывае, калі вынайшоў танную забэтаніроўку кацёльнай:

—Братцы! Дарагія!

Гэта на адным канцавосьці, а на другім-ворагі: падкулачнік Дзянісаў, злодзей Ціханаў.

Ў адных любоў да калектыву, у другіх-варожасьць, адны будуюць, другія шкодзяць. Вэйлер яскрава і праўдзіва паказаў, як рабочая маса, не зважаючы на ніякія труднасьці, зьмятае бруд старых традыцый, паказаў сілу калектыву.

Але няўсёды ёсьць поўны кантакт. Ёсьць месцамі і зрывы. Коля Крошкін, каб не забыцца, што яму патрэбна змазваць сваечасова варцінтонг, прырабляе да ціскоў кручок, які здымаў яму шапку, калі ён пад іх падыходзіў. Задаеш сабе пытаньне: чаму такі дзівацкі ўчынак Крошкіна трактуецца як нешта «остроумное»... Жалезны кручок мог Крошкіну ня толькі напомніць пра змазку, але нават выкалаць вочы. Тут недарэчнасьць.

Недастаткова паказаны роля партыйнай і камсамольскай ячэйкі, месцамі знаходзім пратакольшчыну.

Але ўсё-ж кніжка Вэйлера прыносіць шмат карыснага, яна ня толькі канстатуе факты, але кліча да працы, да барацьбы.

Цікава было-б пачуць слова рабочых гомельскай электрастанцыі пра гэтую кніжку на старонках «Літаратура і Мастацтва».

С. Ш-ч

Перамагчы простал нейнасьць

(Пра п'есу Міровіча „Лён“ у пастаноўцы БДзТ-1)

БДТ-1 сваёй пастаноўкай п'есы ўкраінскага драматурга Ірчана «Плядзь,м» пайшоў па шляху перамаганьня рашэньых памылак творчага парадку, якія былі дапушчаны ў цэлым шэрагу рэчэнейшых пастановак («Справа гонару», «Камяні на дарозе» і інш.).

Пралетарская грамадзкасьць з цікавасьцю сочыць, як адзін з моцных тэатральных арганізмаў разьвіваецца, як ён праводзіць перабудову ўсёй работы, як ён на справе змагаецца за вялікае бальшавіцкае мастацтва.

У даным выпадку мы маем на ўвазе новую пастаноўку БДТ-1 п'есу заслужанага артыста рэспублікі **Міровіча «Лён»**.

Тэма п'ес «Лён»—удзел інтэлігенцыі старой школы ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, псыхалёгічнае перараджэньне індывідуума з вучонага сьвету. Тэмая новая, досыць актуальная, неабходная.

Перад намі тры прафэсары—тры тыпы. Аўсеенка, які ў мінулым быў (з «устралаўскім» душком, пад ўплывам сацыялістычнага будаўніцтва перагледае свае пазыцыі і становіцца на шлях актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, на справе рэалізуючы (лёзунг «навука на службу сацыялізму». Прафэсар Камёч—чалавек з неўстраляваным сьветапоглядам, ён хістаецца, яго лёс будзе на тым баку, адкуль большая сіла прыцягненьня, ён кідаецца, мітусіцца паміж двума сьветамі, паміж сьветам Аўсеенкаў (новым) і паміж сьветам кансэрватыўнага прафэсара біалёгіі; апошні ў сваю чаргу, ніяк ня можа перамагчы сваёй індывідуалістычнай абмежаванасьці, ён сваё «я», ставіць вышэй за калектыў і, нарэшце, становіцца на шлях кандрацьеўшчыны, Апрача гэтай аўтагеннай ідэі аўтар меўся, вырашыць яшчэ некалькі праблем, якія ў п'есе займаюць другараднае месца,—працэс перараджэньня серадняка пад ўплывам няўхільнага росту элемэнтаў калектывізму (Партызан Аўдзей), працэс мэханізацыі сельскай гаспадаркі.

Вось кола пытаньняў досыць актуальных, вялікай значнасьці пытаньняў, пастаўленых аўтарам ў п'есе «Лён». Наколькі аўтару ўдалося вырашыць усе гэтыя праблемы ў сьвятле тых задач, якія пастаўлены партыяй і рабочай клясай перад савецкай драматургіяй і савецкім тэатрам?

У п'есе «Лён» галоўны пэрсанаж—праф. Аўсеенка—чалавек ў мінулым захоплены устралаўшчынай, а значыць чалавек, для якога перабудова сваіх пазыцый павінна праходзіць у складаных формах.

Уладзімер Ільліч Ленін пісаў: «Сьвядомасьць рабочых мас ня можа быць інстынктыўна клясавай сьвядомасьцю, калі рабочы на канкрэтных прыкладах і пры тым абавязкова актуальных чыцца наглядаць кожную з іншых палітычных фактах і падзеях не ву грамадзкіх кляс ва ўсіх праяўленьнях разумовага, пабытовага і палітычнага жыцьця клясаў».

Тым больш працэс ідэалёгічнага пераўзбраеньня вучонага былога устараўзбраеньня вучонага было устралаўца павінен быў быць «на канкрэтных прыкладах». Праўда, мы бачым Аўсеенку ў канкрэтнай рабоце, але-ж перабудова яго пададзена вельмі прасталінейна. Мы канстатуем, што асноўная маса інтэлігенцыі старой школы ў асноўным павярнулася на шлях актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, але-ж мы адначасова канстатуем, што гэтыя зрухі зьявіліся ў выніку супярэчлівых працэсаў у псыхіцы гэтай інтэлігенцыі.

Тут аўтар пайшоў па лініі найменшага супраціўленьня, па лініі канстатаваньня фактаў, ая глыбокага аналізу прычын, якія парадзілі гэтыя факты.

Тым больш незразумелымі зьяўляюцца паводзіны прафэсара-хэміка, які ца паводзіны прафэсара-хэміка, які прыехаўшы ў саўгас, ня верыў у плён сваёй працы, ня верыў у моц творчай энэргіі працоўных мас, глядзеў на яе вачмі скэптыка. А праз некалькі дзён ў часе працы ў лябараторыі ён ужо ўзначальвае паход мас за агратэхніку. Калі мы гаворым, што ў канкрэтнай практычнай дзейнасьці ідэалёгія чалавека перабудоўваецца, набывае новую якасьць, то ў даным выпадку перабудова савецкага спэцыяліста, не магла адбыцца на працягу аднаго антракту. Раскрыцьцё вобразу трэцяг прафэсара адбываецца ў адным і тымжа пляне, у пляне павярхоўнасьці, не абгрунтаванасьці паводзін, упляне не закончанасьці вобразу..

Цэнтральная ідэя п'есы вырашана ня ў пляне дыялектычна-матарыялістычнага мэтаду, а ў пляне пасыўнага сузіраньня, у пляне найменшага супраціўленьня. Ад таго, як вырашана аўтагенная ідэя, як яна афармлена, залежыць вырашэньне падпарадкаваных ідэй—у даным выпадку, мэханізацыя сельскай гаспадаркі, праблема серадняка, барацьба з бюракратызмам, вызваленьне жанчыны з абцугоў мінулага быту. Возьмем пытаньне, не, як аўтар сабе ўяўляе клясавую барацьбу на сучасным этапе. Аўтар пастараўся тут уніжнуць штамаў, але-ж з другога бокуёсьць значныя зрывы. Варожыя элемэнты, праблемы ў калгас, дзейнічаюць на вачох партыйнай ячэйкі, праўда супольна з старшынёй сельсавету. Партыйная ячэйка, лепшыя яе актывісты, захапіўшыся тэхніцызмам, забыліся пра клясавую барацьбу. Дарэчы чаму ў аўтара выпала такая акалічнасьць, як клясавае распластаваньне сярод жанчын, яны ўсе рукамі і нагамі галасуюць за калгасы, за навуку, б'юцца з мужамі.

Больш менш удалося аўтару, прычым мы падкрэсьліваем аўтару, а не тэатру, вырашэньне праблемы серадняка. Партызан Аўдзей і іншыя серадняki пададзены досыць удала, а глыбока асьмысьлена ў супярэчнасьцях. Але тут зноў такі мы павінны адзначыць, што пастаноўшчык вонкава аформіў тып Аўдзея груба натуралістычна, ад чаго часамі губляецца ў чытача вера ў гэтага чалавека. П'еса надзвычай перагружана драматычнымі інтрыгамі, з прычыны чаго глядзіцца сумна, расьцягнута.

Дэкарацыйнае афармленьне пакідае добрае ўражаньне. Яно простае. без асабліва складаных канструкцый і ад начасова пераканальна. Музыка-ж Туранкова не адпавядае тэксту п'есы, яна гучыць дысанансам да дзеяньня на сцэне, а адсюль і не ўзмацняе яго. Наогул стварaецца ўражаньне, што музыка мае на мэце запоўніць доўгія і сумныя антракты.

Падводзячы вынікі працы тэатру над новай пастаноўкай, трэба сказаць, што тэатр і аўтар павінны перагледзець творчы мэтад «Лёну» з мэтай выпраўленьня памылак, з мэтай набліжэньня цэнтральнай ідэі п'есы да шырокіх мас працоўных, шляхам канкрэтызацыі тэмы, і выкупленьня аўтагеннай ідэі якая не павінна губляцца сярод другарадных. Толькі пры ўмове карэннай перапрацоўкі п'есы мы атрымаем добры актуальны спэктакль на актуальную тэму.

Рам Сабаленка.

г. Гомель.

Літгурткі Клімаўшчыны

Па Клімавіцкай філіі Саюзу савецкіх пісьменьнікаў арганізавана 5 літаратурных гурткоў у буйнейшых калгасах і школах. Літгурток калгасу імя Сталіна налічвае 90 сяброў, з якіх пераважная частка калгасьнікаў — ударнікаў і вучняў. Праведзяна 14 заняткаў, дзе распрацованы творы пралетарскіх пісьменьнікаў Беларусі (Александровіча, Галавача, Лынькова і інш.). Гурток выпісвае 68 экз. газэты «Літаратура і Мастацтва» і 14 экз: «Беларусь калгасная». Дрэнна, што няма ніякай дапамогі ў кіраўніцтве і разгортваньні работы з боку партыйнай і камсамольскай ячэек.

Няма кіраўніцтва літгуртком і пры ФЗВ.

Добра працаваў літаратурны гурток пры калгасе «Бальшавік Беларусі». Члены літгуртка былі прымацованы да паасобных брыгад калгасу для правядзеньня сяўбовай і выданьня брыгадных насьценгазэт. Калгас «Бальшавік Беларусі» дабіўся ўзорных прыкладаў разгортваньня нізавога друку. Рэгулярна праходзілі заняткі літгурткоў. Але праца спынена толькі таму, што ня было замацавана далейшае кіраўніцтва літаратурным гуртком.

Літгурток калгасу «Камунар Магілеўшчыны» зараз таксама спыніў працу. Зноў толькі таму, што няма кіраўніцтва ні з боку бюро ФССП, ні з боку партыйнай і камсамольскай ячэйкі калгасу «Камунар Магілеўшчыны».

Трэба пераключыць усю ўвагу на ўмацаваньне арганізаваных літгуткоў — вось задача Клімавіцкай раённай філіі Саюзу савецкіх пісьменьнікаў, партыйнай і камсамольскай арганізацый раёну. Настаўніцтва таксама павінна прыняць самы актыўны ўдзел у разгортваньні работы літаратурных гурткоў.

П. Кавалёў.

Агляд друку

Літстаронка „Палескай Праўды“

Зробім некалькі заўваг пра адну літстаронку Гомельскай раённай газэты «Палеская Праўда» ад 22-га чэрвеня.

Зьмешчаны матар'ял пра рэарганізацыю гомельскай філіі БелАПП у арганізацыю саюзу савецкіх пісьменьнікаў гаворыць, што філія прыступіла да ажыцьцяўленьня пастановы партыі пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый... Апрача тэтага ў літстаронцы зьмешчаны крытычны артыкул пра літстаронкі гэтай-жа газэты, два вершы і апавяданьне.

Тав. Я. Карпашэвіч у сваім крытычным артыкуле пра верш—у тым ліку і пра верш «Лірычны разьбег» Р. Сабаленкі—гаворыць: «Паэт толькі коўзаецца па тэме, замест усебаковага дыялектычнага раскрыцьця таго, аб чым піша»... «Аб калектывізьме, аб заводзе толькі фіксуе факты, але ня ўзьнімаецца да мастацкага сынтэзу іх». Тав. Карпашэвіч, трэба сказаць, крыху лібэральна падышоў да ацэнкі вершу Сабаленкі «Лірычны разьбег».

У «Лірычным разьбегу» Сабаленка бярэ завод толькі як фон, для асноўнай тэмы вершу—каханьне. Паэта перасыпае верш «разьбегамі», «маладосьцямі», «бурамі» і г. д. Ні слова пра завод, пра выкананьне прамфінпляну. За што ахвяруецца «работніца» з заводу «праліць кроў»—з вершу ня відаць.

У вершы Сабаленкі «Брыгадніца», што зьмешчаны ў рэцэнзуемай літстаронцы, нічога няма, апрача такіх радкоў:

«... Дзе ўзялася ходарам хадзіць
Маладая рупная маторнасьць.»
«... Увіхаецца адна з дзьвёх
Загарэлая калгасьніца Гарпіна,
Разгінаецца, і лёгкі «ох»
Ненарокам палае на сьпіну.»

Зусім адсутнічае правільны паказ калгаснага жыцьця. З вершу зусім ня відаць, што жыцьцё Гарпіны ў калгасе палепшылася.

«А дзялянка «шчэ якая, паглядзі!
Хоць куды ўвіхайся.
дык няўпраўка будзе,
Хоць тут да дванаццаці гадзін
Расьпінайся на ўсе трудзі.»

Да гэтага:

«Там Мікіта бегае адзін.
Бяз прытулку шныпарыць па вуліцы.»

Верш Л. Лукашэнкі «Прыстань» насычаны дынамічнасьцю працы на прыстані, жыцьцярадасны, але было-б лепш, каб Лукашэнка паказаў ударніка прыстані, менш ужываючы вобразаў, накшталт «зямля напудрана туманам».

У апавяданьні Л. Мірошнікава «Неспакойны чалавек» больш удалая першая частка, дзе паказваецца дзяцінства Міколы—хлопчыка ўдавы—беднячкі.

Ў другой частцы аўтар імкнуўся паказаць уступленьне і жыцьцё Міколы ў калгасе. але гэты паказ атрымаўся статычным.

Трэба папярэдзіць некаторых таварышоў аб пагрозе чырвонай халтуры (Сабаленка), накіраваць іх на шлях больш глыбокага паказу ў сваёй творчасьці працы на заводзе, у калгасе і ў саўгасе.

Я. Ермаловіч

Забясьпечым спрыяльныя ўмовы для работы савецкіх кампазытараў

XVII партканфэрэнцыя ў сваіх рашэньнях вызначыла ў асноўным контуры другой пяцігодкі і падвяла вынікі трох год першай пяцігодкі. Новыя сацыялістычныя формы працы, з якімі працоўныя выканалі праграму III га рашаючага году пяцігодкі — сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва і г. д., яшчэ не знайшлі патрэбнага адлюстраваньня ў мастацтве. Музыка ў гэтым выпадку найбольш адсталы вучастак.

Партыя і рабочая кляса на парадак дня паставіла задачу разьвіцьця пралетарскай музыкі. Гэта задача клалзецца ў першую чаргу на пралетарскіх кампазытараў і пралетарскую грамадзкасьць. Кампазытар можа даць толькі ў тым выпадку музыку, якая-б адпавядала задачам будаўніцтва сацыялізму, калі ён будзе знаходзіцца ў асяродзьдзі грамадзкасьці, калі ён будзе цесна зьвязаны з вытворчасьцю. Наша грамадзкасьць павінна даць кампазытару усе неабходныя ўмовы для працы, дапамагаць і выпраўляць кампазытара на кожным кроку. Нажаль гэта бывае ня ўсюды. Кампазытары ў большасьці адарваны ад жыцьця. Яны ня маюць патрэбнае дапамогі з боку грамадзкасьці і галоўным чынам з боку літаратурна-мастацкіх аб'яднаньняў.

Прыкладам можа служыць кампазытар М. М. Чуркін, які працуе ў магілеўскім пэдтэхнікуме. Яго творы: «Даеш пяцігодку», «Паходны марш», «Мой марш», «Гэй, наперад, камсамол», «Гады радзілі буру», «Разьлівам паводкі за пяцігодку» і шмат інш. сапраўды даюць псыхіку, энтузыязм рабочых і Чырвонай арміі. Гэтыя песьні ідуць у працоўныя масы і асабліва ў Чырвоную армію, у якой т. Чуркін вядзе работу, абвясьціўшы сябе ўдарнікам на старонках «Чырвонаармейскай праўды», па стварэньню баявых чырвонаармейскіх сьпеваў. Чуркін выбраў правільны шлях. Вывучаючы быт Чырвонай арміі, працуючы сярод байцоў, кампазытар Чуркін стварае песьню для Чырвонай арміі. Чуркін змог бы даць яшчэ больш, але ўмовы, у якіх ён знаходзіцца, не даюць яму ніякай мажлівасьці працаваць у гэтым напрамку. Мала гэтага, напісаныя тав. Чуркіным навуковыя працы, як напрыклад «Рытміка», «Нотная грамата» ня могуць быць належным чынам скарыстаны.

Музычная школа, якая знаходзіцца ў Магілеве, не дапамагае і ня цікавіцца працамі Чуркіна. Музычная школа ведае пра навуковыя працы Чуркіна. Ці пацікавілася яна гэтымі працамі? Няўжо няведае яна, што «Рытміка» амаль зусім не распрацавана ў літаратуры, у той час, калі яна мае надзвычайна вялікае значэньне ва ўсіх працэсах працы? Няўжо ня ведае музычная школа, што напісаная Чуркіным «Нотная грамата» дае магчымасьць безпамылкова вызначыць здольнасьць вучня простым спосабам, вызваляючы ад вывучэньня нуднага, цяжкога, маладаступнага сальфэджыо?

Музычнай школе павінна быць вядома і тое, што скрыпка Чуркіным наближана да масы, дзеля чаго яна перароблена ў пяціструнку, для якой Чуркін напісаў нотную школу, таксама павінна быць вядома, што Чуркіным шмат зроблена ў галіне мэтадалёгіі дзіцячых сьпеваў.

Трэба кампазытараў паставіць у такія ўмовы каб была мажлівасьць ім займацца творчай працай. Трэба вызваліць камапзытараў ад непатрэбнай працы, якая перашкаджае іх творчасьці, забясьпечыць з матарыяльнага боку, больш увагі кампазытарам з боку грамадзкасьці, літаратурна-мастацкіх аб'яднаньняў, стварыць сапраўды неабходныя ўмовы, каб кампазытары маглі прыступіць да стварэньня магнітабуду ў музыцы.

С. Фамін і Ф. Шкуратаў.

Магілёў.

Бяспрытульны ТРАМ

(Менск)

Пры дапамозе ЦК і гаркому камсамолу ў лістападзе 1930 г. арганізаваўся Менскі яўрэйскі ТРАМ. Пры арганізацыі была прынята лепшая рабочая моладзь менскіх прадпрыемстваў. 31 сакавіка 1931 г. яўр. ТРАМ даў пастаноўку «Франты» і менская грамадзкасьць адзначыла, што яўр. ТРАМ зьяўляецца новым дасягненьнем ленінскай нацыянальнай палітыкі і што яўр. ТРАМ адпавядае свайму прызначэньню і здолее справіцца з тымі задачамі, якія на яго ўзложаны. Але яўр. ТРАМ'у трэба вучыцца і вучобу паставіць у цэнтр сваёй дзейнасьці. Пасьля некалькіх спэктакляў яўр. ТРАМ апынуўся ў такім становішчы, што нельга было працаваць, ня было памяшканьня, займаліся ў маленькім пакойчыку, а інвэнтар валяўся ў хляве, сродкаў для аплаты пэдагогаў таксама ня было.

У 1932 г. Наркамасьветы адпусьціў невялікую субсыдыю. Дамовіліся, што гарсавет павінен адпусьціць 15.000 р. але гарсавет да апошняга часу субсыдыі ня выдаў.

З 1-га студзеня па 15 красавіка яўр. ТРАМ працаваў вечарамі штодзённа па 4 гадзіны пасьля працы на прадпрыемствах, дзеля гэтага былі запрошаны лепшыя пэдагогі Менску. 15 сакавіка была праведзена частковая прафэсыяналізацыя, г. зн. былі зьняты 12 асоб з іх непасрэднай працы і пераведзены на сталую працу ў ТРАМ. Працягвала працаваць і вячэрняя група. За месяц была падрыхтавана праграма, прысьвечаная бальшавіцкай сяўбе. Трэба сказаць, што ТРАМ'аўцы працавалі бальшавіцкімі тэмпамі

18 красавіка яўр. ТРАМ выехаў у раёны БССР. За 6 тыдняў было абслужана тры гарады, два мястэчкі і шэсьць нацыянальных калгасаў. Грамадзкасьць усіх пунктаў вітала і адзначыла дасягненьні яўр. ТРАМ'у.

У якім-жа мы зараз становішчы пасьля прыезду з раёну? Па-першае, ня маем памяшканьня для працы, інвэнтар знаходзіцца ў хляве; па-другое матарыяльнае становішча надзвычайна дрэннае. Менская грамадзкасьць павінна зацікавіцца сваім яўр. ТРАМ'ам і недапусьціць, каб развалілася гэта маладая арганізацыя.

Трамавец.

ГІРШ ЦОРФАС

5-га ліпеня г. г., на 27 годзе жыцьця, купаючыся ў рэчцы Сож, трагічна загінуў адзін з таленавітых акцёраў-піянэраў Дзяржаўнага Яўрэйскага Тэатру Беларусі—сын рабочага сталяра Гірш Цорфас.

Яшчэ нават у студыйным пэрыядзе выразна вызначаюцца дзьве асноўныя лініі яго творчай працы: Рэбэ—«Хэйдэр», вар'ят — «На пакаянным ланцугу», Шэйлок—«Шэйлок», рабін—«Кастрылаўка»—гэта паказчыкі гратэскава-камэдыйнага і трагічнага пляну. Асабліва сакавіта і таленавіта ў першым пляне (гратэскава-камэдыйным) зроблены Жэрондт. За час тэатральнага пэрыяду Гірш Цорфас займае адно з адказьнейшых мейс ува усім рэпэртуары: Эстэбан—«Авечая крыніца», Порэц і рабін—«Леккерт», Робэрт—«Джым купэркоп», Гладкіх—«Стрэл» і г. д. Асабліва цікава і ярка паказаў сябе Гірш Цорфас у другім пляне (трагэдыйным) у Глухім і Абломе.

Усё-ж часта дзелячыся з таварышамі ён заўсёды сьцьвярджаў, што яго цягне да эксцэнтрыяды і гэта ён цікава паказваў у этудах і імправізацыях на грамадзкіх выступленьнях у рабочых клюбах і на пэрыфэрыі.

5 ліпеня мы згубілі Гірша Цорфаса.

Мы выказваем глыбокі жаль з прычыны заўчаснай сьмерці нашага таварыша.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр Беларусі згубіў актора, які мог яшчэ шмат зрабіць для нашага тэатру.

Няхай яго заўчасная сьмерць будзе для нас заклікам да яшчэ шчыльнейшага і мацнейшага зьнітаваньня нашага тэатральнага калектыву ў далейшай барацьбе на тэатральным фронце за бальшавіцкае мастацтва.

КАЛЕКТЫЎ ДЗЯРЖАЎНАГА ЯЎРЭЙСКАГА ТЭАТРУ БЕЛАРУСІ.

Гомель.

Адказны радактар Х. ДУНЕЦ

РЭДКАЛЕГІЯ: А. Александровіч, В. Вольскі, І. Гурскі, Х. Дунец, М. Лынькоў, С. Нортман, М. Рафальскі, А. Рымашэўскі, І Харык, К. Чорны

Выдае Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі.

Друкарня імя Сталіна Менск

Упаўнаваж. Галоўліту № А—668